НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ
ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА І ЯНКІ КУПАЛЫ

УДК 821.161.3.09-3

**БАРОЎКА**
**Ванда Юльянаўна**

# МАСТАЦКАЕ НАРОДАЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ XX СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені
доктара філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2010

Работа выканана ў дзяржаўнай навуковай установе
"Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

| | |
|---|---|
| Навуковы кансультант – | **Гіламедаў Уладзімір Васільевіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік, галоўны спецыяліст ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі" |
| Афіцыйныя апаненты: | **Штэйнер Іван Фёдаравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"; **Жук Ігар Васільевіч**, доктар філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры беларускай літаратуры УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"; **Марозаў Аляксандр Уладзіміравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела культуры славянскіх народаў ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі" |
| Апаніруючая арганізацыя – | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** |

Абарона адбудзецца "29" верасня 2010 г. а $14^{00}$ на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.43.02 пры Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2; e-mail: inlinasbel@tut.by; тэл. 017 284 18 85).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы "19" жніўня 2010 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат філалагічных навук — Бразгуноў А.У.

Зварот айчыннага літаратуразнаўства да вывучэння ўзаемаадносін грамадскага жыцця і літаратуры, літаратуры і фальклору, літаратуры і міфалогіі прадэманстраваў тэарэтычную прадуктыўнасць і метадалагічную плённасць. мастацкае ж народазнаўства на матэрыяле нацыянальнага прыгожага пісьменства пакуль не атрымала належнага канцэптуальна-сістэмнага даследавання. Між тым тэарэтычная і практычная неабходнасць, сацыяльная наспеласць такога роду навуковай працы тлумачацца запатрабаваннямі часу, бо інтэнсіўны дыялог культур у сучасным інфармацыйным грамадстве істотна абвастрае пытанне аб існаванні літаратур з ярка выяўленым нацыянальным пачаткам. акрамя таго. ва ўмовах XXI стагоддзя няўхільна ўзрастае роля міжнацыянальнай камунікацыі, што надае асаблівае значэнне цікавасці з боку сусветнай супольнасці да этнакультурнай адметнасці і сродкаў яе ўвасаблення ў розных відах мастацтва. Актуальнасць даследавання вынікае таксама з агульнагуманітарнай значнасці выпрацоўкі новых варыянтаў спасціжэння і захавання этнакультурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі, з неабходнасці абагульнення разнастайных навуковых падыходаў да вывучэння народазнаўчага матэрыялу ў мастацкіх творах. з паглыблення тэарэтычных пошукаў літаратуразнаўцаў у галіне асэнсавання тыпалогіі айчыннай прозы XX стагоддзя. Канцэптуальна-сістэмнае вывучэнне мастацкага народазнаўства на матэрыяле беларускай прозы мінулага стагоддзя, такім чынам, бачыцца перспектыўным у гісторыка-культурным, тэарэтычным і метадалагічным планах.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі**. Работа выканана ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай фундаментальных даследаванняў "Даследаванне беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснага стану ў сувязі з іншымі славянскімі мовамі, распрацоўка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу (Беларуская мова і літаратура)" у рамках праектаў "Літаратурныя традыцыі Віцебшчыны ў кантэксце славянскіх культур" (2001–2005 гг., № дзярж. рэгістрацыі 20033435), "Літаратура Віцебшчыны ў славянскім культурным кантэксце: гісторыя, сучаснасць, перспектывы" (2006–2010 гг., № дзярж. рэгістрацыі 20062120).

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта* дысертацыйнай работы заключаецца ў канцэптуальнай, шматаспектнай характарыстыцы мастацкага народазнаўства як важнага фактару ідэйна-эстэтычнай поліфаніі беларускай прозы XX стагоддзя. У адпаведнасці з абранай мэтай ставяцца наступныя *задачы*:

- абагульніць і ўдакладніць навуковыя ўяўленні пра асаблівасці мастацкага асэнсавання народа;
- вызначыць асноўныя дэтэрміпанты прысутнасці народазнаўчага плана ў творах айчынных празаікаў;
- выявіць асаблівасці мастацкага народазнаўства ў прозе пісьменнікаў Беларусі ва ўмовах шматкультурнасці і полілінгвізму 1920–1930-х гадоў;
- вылучыць эстэтычна прадуктыўныя сродкі і прыёмы мастацкага народазнаўства ў айчыннай прозе;
- устанавіць тыпы, віды, функцыі народазнаўчага матэрыялу ў творах беларускіх пісьменнікаў;
- даследаваць дынаміку мастацкага народазнаўства ў айчыннай прозе XX стагоддзя і эвалюцыю ў выкарыстанні пісьменнікамі народазнаўчага матэрыялу;
- прааналізаваць суадносіны паміж народазнаўчым матэрыялам у літаратурных творах, жанрам і мастацкім метадам;
- прасачыць ролю мастацкага народазнаўства ў фарміраванні нацыянальнага празаічнага стылю і рэпрэзентацыі індывідуальных аўтарскіх стыляў.

**Аб'ект і прадмет даследавання**. *Аб'ект* даследавання – мастацкае народазнаўства ў беларускай прозе XX стагоддзя, паколькі айчынныя пісьменнікі назапасілі дастаткова багаты вопыт у эстэтычным асэнсаванні нацыянальнай рэчаіснасці. Для кампаратыўна-кантрастыўных мэт у якасці канцэптуальнага фону фрагментарна выкарыстоўваюцца творы аўтараў іншых літаратур свету. *Прадмет* даследавання – ракурсы асэнсавання народа, дэтэрмінацыя прысутнасці, прынцыпы ўключэння, функцыі народазнаўчага матэрыялу, яго эвалюцыя ў творах беларускіх празаікаў XX стагоддзя, што дазваляе ўсебакова ахарактарызаваць феномен мастацкага народазнаўства як з'явы эстэтычнага парадку.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Адметнасць мастацкага асэнсавання народа тлумачыцца асаблівасцямі эстэтычнага асваення свету ў літаратуры, якое ажыццяўляецца ў вобразнай слоўнай форме, дзе спалучаюцца аб'ектыўнае і суб'ектыўнае, канкрэтнае і абагульненае, лагічнае і інтуітыўнае, таму вынікі мастацкага народазнаўства генетычна дыялагічныя і кантэкстуальныя.

2. Адчувальная прысутнасць народазнаўчага плана ў беларускай прозе XX стагоддзя дэтэрмінавалася як аб'ектыўнымі (складанасць нацыянальнага быцця, развіццё ў полікультурнай прасторы, іманентныя ўласцівасці літаратуры), так і суб'ектыўна-асобаснымі фактарамі (стаўленне пісьменнікаў да нацыянальнай празаічнай традыцыі, паглыбленая асабістая зацікаўленасць аўтараў жыццём суайчыннікаў).

3. Асобым перыядам у развіцці слоўнага мастацтва Беларусі мінулага стагоддзя сталі 1920–1930-я гады, калі ва ўмовах полілінгвізму і

полікультурнасці фарміраваўся шматлітаратурны працэс. Мастацкае народазнаўства ў творчасці тагачасных празаікаў было накіравана на першачарговае спасціжэнне пісьменнікамі рэалій свайго ўласнага нацыянальнага свету ў зменлівых сацыягістарычных абставінах, што аб'ектыўна падкрэслівала эстэтычную ідэнтычнасць іншанацыянальных аўтараў.

4. Эстэтычна прадуктыўнымі сродкамі мастацкага народазнаўства ў айчыннай прозе выступалі мастацкі этнаграфізм, фалькларызм, міфалагізм. Да ліку дамінантных прыёмаў мастацкага народазнаўства належалі апісанні ад імені аўтара, апавядальніка ці персанажаў, пададзеныя асобна або ў іх спалучэнні; метаапісанні; выкарыстанне сіметрычнага этнатопу, фальклорных вобразаў і матываў, аўтаэтнастэрэатыпаў, гетэраэтнастэрэатыпаў.

5. Узноўлены ў творах беларускіх празаікаў XX стагоддзя народазнаўчы матэрыял – рознаўзроўневая, шматзначная, поліфункцыянальная ідэйна-эстэтычная з'ява.

6. Дынаміка мастацкага народазнаўства ў беларускай прозе XX стагоддзя – гэта змена ракурсаў пазнання пісьменнікамі народнага свету, тыпаў, відаў і функцый народазнаўчага матэрыялу ў літаратурных творах. Эвалюцыя ў выкарыстанні народазнаўчага матэрыялу заключалася ў паступовай замене эмпірычна-рэпрадуктыўнага ўзроўню адлюстравання творчым, замяшчэнні разгорнутых этнаграфічных апісанняў семантычна важнымі дэталямі, ва ўзрастанні эстэтычнай значнасці сэнсавага плана малюнкаў увасобленага пісьменнікамі народнага свету.

7. Мастацкая структура і вобразны лад айчыннай прозы складваліся перш за ўсё на аснове паказу жыцця беларускай вёскі. Наяўнасць узноўленага пісьменнікамі народазнаўчага матэрыялу спачатку істотна не ўплывала на жанравую ідэнтыфікацыю празаічных твораў, і толькі з другой паловы XX стагоддзя, калі ў нацыянальнай літаратуры значна пашырыўся сацыямастацкі спектр даследавання, народазнаўчы матэрыял становіцца адным з атрыбутыўных паказчыкаў жанравай прыналежнасці твора.

8. Спецыфіка адбору і ўключэння беларускімі пісьменнікамі народазнаўчага матэрыялу ў структуру літаратурнага твора залежала ад мастацкіх метадаў, а семантыка і функцыянаванне народазнаўчага матэрыялу ўплывалі на іх паэтыку.

9. Мастацкае народазнаўства выступала адным з важных стылеўтваральных фактараў у межах нацыянальнай празаічнай традыцыі, выяўляла творчую індывідуальнасць пісьменнікаў.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае навуковае даследаванне. Публікацыі па тэме дысертацыйнай работы напісаны без сааўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка ў вывучэнне гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі** ажыццяўлялася на навуковых сесіях прафесарска-выкладчыцкага саставу Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Даклады і паведамленні па тэме дысертацыйнай працы былі зроблены на 67 навуковых канферэнцыях, 40 з іх міжнародныя, у тым ліку: Янка Купала і "Наша ніва" (Мінск, 1996 г.); IV, V, VI, VII міжнародныя навуковыя канферэнцыі "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства і культуралогія" (Віцебск, 1997, 2000, 2003, 2006 гг.); III, IV міжнародныя чытанні, прысвечаныя творчасці Яна Баршчэўскага (Віцебск, 2000, 2004 гг.); Германскі і славянскі светы: узаемаўплыў, канфлікты, дыялог культур (гісторыя, урокі, вопыт, сучаснасць) (Віцебск, 2001 г.); "Янка Купала і еўрапейскі літаратурны кантэкст": VI міжнародныя Купалаўскія чытанні (Мінск, 2002 г.); Гісторыя і культура Еўропы ў кантэксце станаўлення і развіцця рэгіянальных цывілізацый і культур: актуальныя пытанні гістарычнага мінулага і сучаснасці (Віцебск, 2003 г.); Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся (Гомель, 2004, 2006 гг.); Сучасная герменеўтыка і інтэрпрэтацыя мастацкага тэксту (лінгвістычны, літаратуразнаўчы і дыдактычны аспекты) (Вільнюс, 2004 г.); Беларуска-польска-ўкраінскае філалагічнае памежжа: гісторыя, сучасны стан, будучыня (Брэст, 2004 г.); IV міжнародная навуковая канферэнцыя "Літаратура – Мова – Культура" (Мінск, 2004 г.); II міжнародная канферэнцыя з цыкла "Шматмоўнасць і шматкультурнасць польска-ўсходнеславянскага пагранічча – толькі наступства Вялікага княства Літоўскага ці шанц на будучае?" (Беласток, 2004 г.); XIV міжнародная навуковая канферэнцыя "Польска-беларускія культурныя, літаратурныя і моўныя сувязі" (Мінск, 2005 г.); "Мова і культура" імя праф. С. Бурагі (Кіеў, 2005, 2006, 2007 гг.); Руская і беларуская літаратуры мяжы XX–XXI стагоддзяў (Мінск, 2006 г.); Латгальскі кангрэс (Даўгаўпілс, 2007 г.); VIII міжнародная навуковая канферэнцыя "Мастацкі тэкст: балта-славянскія моўныя і літаратурныя сувязі" (Вільнюс, 2008 г.); Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння (Мінск, 2008 г.); XII міжнародная навуковая канферэнцыя "Узаемадзеянне літаратур у сусветным літаратурным працэсе. Праблемы тэарэтычнай і гістарычнай паэтыкі" (Гродна, 2008 г.); VIII міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства" (Віцебск, 2009 г.).

Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні навукова-тэарэтычнага семінара "Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства" пры Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі (пратакол № 6 ад 27.01.2010 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 105 публікацыях,

сярод якіх 2 манаграфіі, 2 раздзелы ў калектыўных манаграфіях, 1 вучэбны дапаможнік, 61 артыкул (з іх 30 надрукаваны ў рэкамендаваных ВАК навуковых часопісах), 39 матэрыялаў канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый па тэме дысертацыі, якія адпавядаюць пункту 18 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь", складае 42,2 аўтарскага аркуша, агульны аб'ём іншых публікацый (раздзелаў у кнігах, вучэбных дапаможнікаў, артыкулаў у навуковых зборніках, матэрыялаў дакладаў на навуковых канферэнцыях) – 29,3 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (450 адзінак , з іх спіс выкарыстаных крыніц змяшчае 345 адзінак, спіс публікацый саіскальніка – 105 адзінак) і дадатка. Агульны аб'ём дысертацыі – 233 старонкі; асноўны тэкст займае 199 старонак, спіс літаратуры – 32 старонкі, дадатак – 2 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва "**Уводзінах**" абгрунтоўваюцца выбар тэмы, яе значнасць і актуальнасць, агаворваецца, што мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры XX стагоддзя вывучаецца на матэрыяле прозы, паколькі прозе ўласцівы вялікія магчымасці ў адлюстраванні рэчаіснасці, разнастайнасць спосабаў апавядання, багацце вобразна-выяўленчых сродкаў, адсутнасць строгай рэгламентацыі ў іх ужыванні.

Першыя спробы тэарэтычнага абагульнення пісьменніцкага вопыту ў сферы мастацкага народазнаўства былі прадстаўлены ў працах І.Г. Гердэра, І.-А. Тэна, А.М. Весялоўскага, А.М. Пыпіна. Каштоўнымі назіраннямі над адметнасцю ўвасаблення нацыянальнага свету ў літаратуры вылучаюцца даследаванні В.М. Жырмунскага, В.Р. Базанава, Г.Д. Гачава, Ю.М. Лотмана, А.Л. Факеева, І.А. Чароты. Важнае значэнне ў асэнсаванні функцыянавання фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу ў творах прыгожага пісьменства належыць навуковым работам А.А. Гарэлава, М.М. Грынчыка, У.Б. Далгат, В.Ф. Сакаловай, Н.М. Шуміды. Пытанні ўвасаблення майстрамі мастацкага слова нацыянальнай рэчаіснасці закраналіся вядомымі беларускімі вучонымі А.М. Адамовічам, А.І. Бельскім, Д.Я. Бугаёвым, Л.Я. Гараніным, В.А. Каваленкам, У.А. Калеснікам, У.М. Конанам, Л.Д. Корань, І.Я. Навуменкам, В.А. Максімовічам, М.І. Мушынскім, М.А. Тычынам, І.П. Чыгрыным, Т.І. Шамякінай, А.С. Яскевічам і іншымі. Нягледзячы на гэта, у нацыянальным літаратуразнаўстве да апошняга часу адсутнічала канцэптуальна-сістэмнае даследаванне мастацкага народазнаўства як важнага фактару ідэйна-эстэтычнай поліфаніі беларускай прозы мінулага стагоддзя. Вывучэнне мастацкага

народазнаўства дазваляе больш дэталёва прасачыць узаемадачыненні беларускай рэчаіснасці і мастацтва слова, шырэй асэнсаваць праблемы пераемнасці ў літаратурным развіцці, адкрывае новыя навуковыя далягляды для паглыбленага даследавання тыпалагічных асаблівасцей айчыннай прозы XX стагоддзя і нацыянальных літаратур увогуле.

Матэрыялам для навуковага аналізу ў дадзенай рабоце абраны найбольш рэпрэзентатыўныя з пункту гледжання выкарыстання народазнаўчага матэрыялу творы айчынных пісьменнікаў.

У першым раздзеле "**Мастацкае народазнаўства: тэарэтычны аспект**" абагульняюцца і ўдакладняюцца навуковыя ўяўленні пра асаблівасці мастацкага асэнсавання быцця і культуры народа, аналізуецца дэтэрмінацыя прысутнасці народазнаўчага плана ў літаратурных творах. Выказваецца меркаванне, што ў кампетэнцыю мастацкага народазнаўства першачаргова ўваходзяць асэнсаванне і ўвасабленне сродкамі літаратуры рэалій жыцця, характару чалавека як прадстаўніка пэўнага народа, якое ў межах канкрэтнага твора выконвае шэраг ідэйна-эстэтычных функцый. Спецыфіка мастацкага народазнаўства прадвызначаецца вобразнай формай пазнання свету ў прыгожым пісьменстве, дзе сінтэзуюцца аб'ектыўнае і суб'ектыўнае, агульнае і індывідуальнае, рацыянальнае і эмацыянальнае, лагічнае і інтуітыўнае. Спасціжэнне быцця і культуры народа сродкамі літаратуры грунтуецца на спалучэнні жыццёвага матэрыялу і мастацкага вымыслу. Праз адзінкавае, зменлівае пісьменнікамі раскрываецца агульнае, сутнаснае, нярэдка пры гэтым назіраюцца тэндэнцыйнае завастрэнне рыс рэальнага свету, сімвалізацыя жыццёвых з'яў. Багацце сэнсава значных дэталей, абумоўленыя вобразнай слоўнай формай экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць у падачы народазнаўчай інфармацыі ствараюць ілюзію жыццёвай верагоднасці ўзноўленых аўтарам рэчаіснасці і характараў.

Вынік мастацкага асэнсавання народнага свету прадстае ў форме суб'ектыўных вобразаў аб'ектыўнай рэальнасці як плён дзейнасці пісьменніцкага ўяўлення ў адпаведнасці з жыццёвым вопытам, творчымі ўстаноўкамі аўтара, эстэтычнымі прынцыпамі канкрэтнага мастацкага метаду, сацыякультурнымі абставінамі часу. Мастацкае народазнаўства – з'ява эстэтычнага парадку, яно суб'ектыўнае ў гнасеалагічным плане, бо ўсе элементы літаратурнага твора канцэптуальна арганізуюцца пісьменніцкай свядомасцю, дэтэрмінуюцца творчай задумай, аўтарскай ацэнкай з'яў рэчаіснасці, таму кожны пісьменнік адлюстроўвае той аспект народнага свету, які лічыць найбольш вартым увагі. Узровень спасціжэння народнага жыцця, глыбіня яго непасрэднага адлюстравання залежаць ад творчай індывідуальнасці: пісьменнікі могуць выбіраць для даследавання адны і тыя ж факты, з'явы, падзеі, але даваць ім розную інтэрпрэтацыю. Адлюстраваныя

майстрамі мастацкага слова жыццёвыя з'явы і характары ўтрымліваюць у сабе ацэначны план, даюць магчымасць творчай асобе мадэляваць свой эстэтычны ідэал народнага жыцця і народнага характару.

Пазнавальная каштоўнасць вынікаў мастацкага народазнаўства выяўляецца шляхам суаднясення твора з рэчаіснасцю, якую аўтар адлюстроўвае, эстэтычная – у майстэрстве арганізацыі аповеду. Пазнавальны і эстэтычны аспекты народазнаўчай інфармацыі ў літаратурных творах часта знаходзяцца ў неадназначнай сувязі, бо пісьменнікі могуць насычаць свае творы народазнаўчымі звесткамі, але не клапаціцца пра належную форму іх падачы, і наадварот, аўтары могуць цікава і займальна апавядаць пра пэўны народны свет, але пры гэтым дапускаць недакладнасці ў яго паказе.

Вобразная слоўная форма абумоўлівае адметную семантычную напоўненасць узноўленай аўтарам рэальнасці, таму мастацкае народазнаўства адпачаткова дынамічнае і кантэкстуальнае. Асобныя дэталі, вобразы і сама цэласная карціна жыцця і нораваў у літаратурных творах дыялагічныя па сваёй сутнасці: кожнае новае прачытанне твора адкрывае свае сэнсавыя грані ў пісьменніцкім увасабленні свету і чалавека, а гэта нярэдка дапаўняе, адмяняе ці рэдукуе ранейшыя высновы літаратуразнаўцаў адносна глыбіні і майстэрства ў спасціжэнні народнага жыцця тым ці іншым пісьменнікам.

Мастацкае народазнаўства як канцэптуальнае, ініцыятыўна-творчае ўзнаўленне рыс характару, быту, культуры пэўнага народа ў літаратуры, як эстэтычнае канструяванне вобраза народа ажыццяўляецца праз выбар у адпаведнасці з аўтарскімі задачамі адэкватных сродкаў і прыёмаў увасаблення свету і чалавека, выяўленне і вывучэнне якіх – важны і пакуль мала распрацаваны аспект ў даследаванні мастацкага народазнаўства. Вырашэнне яго дае магчымасць вызначыць рэлевантныя рысы пэўнай творчай індывідуальнасці і канкрэтнай нацыянальнай літаратуры. Дастаткова распаўсюджанымі сродкамі эстэтычнага ўзнаўлення народнага жыцця і культуры выступаюць мастацкі этнаграфізм, фалькларызм, міфалагізм. Да пашыраных прыёмаў мастацкага народазнаўства належаць апісанні ад імені аўтара, апавядальніка, персанажаў, якія падаюцца ў творах асобна або ў іх спалучэнні; метаапісанні; выкарыстанне вобразаў і матываў вуснай народнай творчасці, непасрэдных выказванняў персанажаў пра свой і іншыя народы; выбар праблемна-тэматычнай асновы, этнатопу, разгалінаванай сістэмы персанажаў, найбольш прыдатнага жанру, моўна-выяўленчых сродкаў.

У беларускай прозе XX стагоддзя мастацкае народазнаўства суадносілася з пазамастацкай і мастацкай рэальнасцю. Развіццё айчыннага прыгожага пісьменства ў полікультурнай прасторы падтрымлівала нязменную ўвагу беларускіх пісьменнікаў да лёсу, гісторыі і культуры свайго народа дзеля артыкуляцыі яго нацыянальнай ідэнтычнасці. Складанасць гістарычнага быцця

беларусаў у мінулым стагоддзі, ператварэнне Беларусі сялянскай у Беларусь індустрыяльную забяспечылі трывалую цікавасць пісьменнікаў да нацыянальнага кантэксту ў шырокім сэнсе слова, а нацыянальны кантэкст перш за ўсё рэпрэзентаваўся праз этнаграфічна-бытавое як найбольш відавочнае. Бытавая і быційная сітуацыі на Беларусі, асабліва ў пачатку і другой палове мінулага стагоддзя, абумовілі дамінаванне ў творчасці празаікаў матываў так званага ідылічнага хранатопу, адна з іманентных уласцівасцей якога – уяўленне пра мінулае як пра найлепшы час, паэтызацыя роднага кута. Прыярытэтная ўвага да народазнаўчага матэрыялу тлумачылася таксама тым, што айчынныя пісьменнікі звычайна паказвалі асобу ў сферы сацыяльна-бытавых узаемадачыненняў, праз быт, пераважна вясковы, у якім захоўвалася шмат рэліктавых рыс, выходзілі на эстэтычную рэканструкцыю гісторыі народа, асэнсаванне нацыянальнага быцця. Вядучым мастацкім метадам у беларускай прозе XX стагоддзя стаў рэалізм, а паэтыка рэалізму ў многім грунтуецца на павышанай цікавасці да абставін як вельмі ўплывовай дэтэрмінантнай сілы. Прысутнасць народазнаўчага матэрыялу ў творах айчынных празаікаў абумоўлівалася таксама і ўнутранымі законамі мастацкай творчасці, логікай пісьменніцкіх адносін да нацыянальнай празаічнай традыцыі, асабістай зацікаўленасцю аўтараў гісторыяй народа, яго псіхалагічным абліччам, побытам, культурай.

Паводле дамінантных спосабаў уключэння ў структуру твора мэтазгодна вылучыць такія тыпы народазнаўчага матэрыялу, як *аб'ектывізаваны*, калі звесткі народазнаўчага характару непасрэдна падаюцца ад імені аўтара (К. Каганец, А. Кулакоўскі, А. Чарнышэвіч, В. Карамазаў); *суб'ектывізаваны*, калі народазнаўчы матэрыял уводзіцца праз успрыманне персанажа (В. Каваль, М. Стральцоў, ранні В. Адамчык); *сімбіятычны*, калі назіраецца не толькі спалучэнне ў межах твора двух папярэдне названых тыпаў, але і іх узаемаабумоўленае суіснаванне (Я. Колас, М. Гарэцкі, І. Мележ, Я. Брыль, У. Караткевіч). У беларускай і ў сусветнай прозе з другой паловы XX стагоддзя гэты тып уключэння народазнаўчага матэрыялу фактычна стаў цэнтральным.

Глыбіня асэнсавання народнага свету заўсёды вызначаецца аўтарскай задумай і маштабам пісьменніцкага таленту. Адносіны творцаў да жыццёвых фактаў бываюць або рэпрадуктыўныя, або рэфлектыўныя. На падставе гэтага можна вылучыць два асноўныя *прынцыпы* выкарыстання народазнаўчага матэрыялу – *захаванне аўтахтоннасці* народазнаўчых адзінак у тэксце і іх *трансфармацыя*. Паводле ж ступені аўтарскай самастойнасці ў асваенні народазнаўчай першаасновы і далейшага выкарыстання гэтай першаасновы ў структуры твора варта выдзеліць такія функцыянальныя *ўзроўні* асваення народазнаўчага матэрыялу, як *рэпрадуктыўна-эмпірычны*, калі аўтар падае этнаграфічныя звесткі і фальклорна-этнаграфічныя элементы без мастацкай

апрацоўкі і практычна аўтаномна ў структуры твораў, і *крэатыўны*, або *творчы*, калі народазнаўчы матэрыял значна трансфармуецца, актыўна ўзаемадзейнічае з іншымі элементамі структуры літаратурнага твора, выконвае не толькі ўласна пазнавальную, але і выяўленчую ролю.

Паводле сферы ўзнаўлення народазнаўчы матэрыял у літаратурных творах падзяляецца на *сацыяльны*, калі паказваюцца рэаліі, уласцівыя пэўнай сацыяльнай групе (у беларускай прозе XX стагоддзя па экстралітаратурных прычынах найбольш поўна даследаваны сацыяльны быт сялянства); *бытавы*, дзе падаюцца побытавыя падрабязнасці (рэчы, стравы, асаблівасці сямейных і міжасобасных адносін, звычаі, святы і г.д.); *пейзажны*, калі адлюстроўваюцца пейзажы, характэрныя для пэўнай мясцовасці. Вылучаныя на падставе сферы эстэтычнага ўзнаўлення віды народазнаўчага матэрыялу ў канкрэтным творы могуць выступаць і ў асобных праявах, і ў спалучэннях (асабліва часта пераплятаюцца сацыяльны і бытавы віды), утвараючы пры гэтым цэласна змадэляваны пісьменнікам народазнаўчы субстрат, які перадае шматстайнасць і цэласнасць праяў розных бакоў нацыянальнай рэчаіснасці. У залежнасці ад таго, паказваюцца пісьменнікамі адметнасці жыцця насельніцтва ўсёй краіны ці толькі нейкага асобнага рэгіёна, адрозніваюць *агульнанацыянальны*, калі рэпрэзентуецца матэрыяльная і духоўная культура менавіта пэўнага народа (проза Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Чорнага, У. Караткевіча), і *рэгіянальна-абласны* народазнаўчы матэрыял, калі адлюстроўваюцца асаблівасці быту і светаадчування, уласцівыя насельнікам нейкага асобнага рэгіёна (напрыклад, у "Палескай хроніцы" І. Мележа ўзнаўлялася жыццё палешукоў 1920–1930-х гадоў, у "Нерушы" В. Казько – насельнікаў Палесся другой паловы мінулага стагоддзя, у творчасці В. Адамчыка – рэаліі заходнебеларускага свету).

Пададзены пісьменнікам народазнаўчы матэрыял у сістэме мастацкага твора выконвае разнастайныя функцыі, да ліку асноўных належаць: *культуралагічная*, *характаратворчая*, *сюжэтна-кампазіцыйная*, *сэнсава-генератыўная*, *жанраўтваральная*, *стылеўтваральная*. Культуралагічная функцыя заключаецца ў рэпрэзентацыі пэўнага народа ў канкрэтны гістарычны перыяд яго развіцця, што збліжае мастацтва слова з навукай, у прыватнасці, з гісторыяй, этнаграфіяй, сацыялогіяй. Гэта функцыя прысутнічае ў літаратуры са старадаўніх часоў, мяняюцца толькі прыёмы яе непасрэднай рэалізацыі ў творчасці кожнага з аўтараў. Ідэйна-мастацкая сутнасць напісанага празаікам даходзіць да свядомасці чытача тады, калі пісьменнік пераканаўча раскрывае характары персанажаў. З дапамогай элементаў мастацкага народазнаўства героі твораў рэпрэзентуюцца не толькі нацыянальна, але і гістарычна, сацыяльна, псіхалагічна, этычна. Сюжэтна-кампазіцыйная функцыя рэалізуецца праз дзейсны ўдзел народазнаўчага матэрыялу ў арганізацыі падзей, пра якія расказваецца ў творы. Элементы мастацкага народазнаўства дастаткова часта

выконваюць яе ў дэтэктыўных, прыгодніцкіх творах. Сэнсава-генератыўная функцыя выяўляецца ў тым, што народазнаўчы матэрыял дазваляе надаць аповеду і паэўнай, на-мастацку ўзноўленай пісьменнікам з'яве шырокі абагульняльны сэнс. Гісторыя нацыянальнай прозы сведчыць, што ў межах канкрэтнага твора народазнаўчы матэрыял часта выконвае адразу некалькі функцый. Так, у рамане "Людзі на балоце" І. Мележа перш за ўсё выяўляюцца культуралагічная, сюжэтна-кампазіцыйная, характаратворчая функцыі народазнаўчага матэрыялу, у творы "Перуш" В. Казько – культуралагічная, характаратворчая, сэнсава-генератыўная і сюжэтна-кампазіцыйная функцыі.

Такім чынам, у першым раздзеле працы раскрываюцца тэарэтычныя і гісторыка-літаратурныя асновы даследчыцкай канцэпцыі мастацкага народазнаўства, вылучаюцца тыпы, віды, функцыі народазнаўчага матэрыялу ў літаратурных творах. Адзначым, што прапанаваныя намі класіфікацыі народазнаўчага матэрыялу не прэтэндуюць на ўніверсальнасць, а закліка        сістэматызаваць і аптымізаваць аналіз твораў прыгожага пісьменства ў святле абранай тэмы. Паводле даследчыцкай думкі, метадалогія пазнавальнага разгортвання праблемы мастацкага народазнаўства павінна распрацоўвацца з улікам канкрэтных сацыягістарычных абставін.

Другі раздзел "**Станаўленне і развіццё мастацкага народазнаўства ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя**" складаецца з трох падраздзелаў.

У падраздзеле **2.1 "Вытокі мастацкага народазнаўства"** сцвярджаецца, што паказ народнага побыту і культуры бярэ свой пачатак са старажытнай літаратуры. Да ўключэння этнаграфічнага матэрыялу ў тэксты першачаргова схільнымі былі аўтары летапісаў, часткова хаджэнняў і жыцій. Народазнаўчы план арганічна ўваходзіў у "Слова аб палку Ігаравым" праз згадванне воінскіх звычаяў, працоўную, ратную і паляўнічую лексіку, праз проціпастаўленне "зямлі Рускай" "зямлі Палавецкай". Багата звестак пра нашых продкаў, іх норавы, паводзіны змяшчалі "Аповесць мінулых часоў", беларуска-літоўскія летапісы. З далейшым развіццём свецкага напрамку ў старажытнай літаратуры ў ёй узмацнялася ўвага да этнічнага фону, чалавечага побыту, індывідуальнага лёсу асобы. Шырокай этнаграфічна-бытавой панарамай жыцця шляхты і сялянства вызначалася гістарычна-мемуарная літаратура XVII стагоддзя, у прыватнасці, "Дзённік" Ф. Еўлашоўскага, "Баркулабаўская хроніка".

Старажытная літаратура – гэта не толькі мастацтва слова, яна выконвала важнейшыя пазамастацкія функцыі: дзелавую, інфармацыйную, рытуальна-культавую. Устойлівыя этнаграфічныя тэндэнцыі ў старажытнай літаратуры выклікаліся неабходнасцю занатаваць народны быт і культуру як гістарычны факт, яны тлумачыліся таксама імкненнем творцаў да надання эфекту гранічнай аб'ектыўнасці ў асвятленні рэальнасці. Спалучэннем рэпрадуктыўных і

рэфлектыўных адносін пісьменнікаў да жыццёвай першаасновы вылучалася сатырычная проза беларускага барока, дзе народазнаўчы матэрыял нярэдка эстэтычна трансфармаваўся ў адпаведнасці з аўтарскай задумай высмеяць недахопы грамадства і заганы чалавечага характару, што пераканаўча пацвярджае змест "Прамовы Мялешкі" і "Ліста да Абуховіча".

На глебе рэгіянальнага патрыятызму, пад моцным уплывам эстэтыкі і паэтыкі рамантызму, што адкрыў літаратуру як з'яву нацыянальную ў сваёй аснове, у першай палове XIX стагоддзя актыўна развівалася польскамоўная літаратура, аўтары яе шмат увагі надавалі адлюстраванню матэрыяльнай і духоўнай культуры, псіхалагічнага аблічча насельнікаў роднага краю. Адрэфлексаваны рамантыкамі народазнаўчы матэрыял артыкуляваў мясцовую бытавую, сацыяльную, пейзажную экзотыку, а праз сюжэты, узятыя пісьменнікамі з вуснай народнай творчасці, не столькі выяўляліся асаблівасці народнага светабачання, колькі маральныя імператывы творцаў. Этнаграфічны матэрыял у культуралагічнай і характаратворчай ролі арганічна ўваходзіў у польскамоўныя нарысы, фантастычныя (проза Я. Баршчэўскага) і гумарыстычныя (творы Асорыі, А. Плуга) апавяданні. Адным з самых значных польскамоўных твораў першай паловы XIX стагоддзя стала кніга "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" Я. Баршчэўскага, дзе мастацкі этнаграфізм не толькі рэканструяваў старадаўні народны быт у шляхецкім і сялянскім варыянтах, але і ўзмацняў семантычны патэнцыял эпічнасці за кошт іншасказання, дапамагаў пісьменніку мадэляваць дасканалую, з яго пункту гледжання, нацыянальную рэчаіснасць. Сядзіба шляхціца Завальні ў творы прадстала абагульненым вобразам ідэальнага, паводле Я. Баршчэўскага, беларускага Дому, грамадства, у якім пануюць талерантнасць, павага да чалавека, культ працы.

Беларусь у XIX стагоддзі была аб'ектам пільнай увагі этнографаў і фалькларыстаў. У іх паасобных працах уласна народазнаўчы дыскурс істотна дапаўняўся мастацкім ("Падарожжа па Палессі і Беларускім краі", "Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках" П. Шпілеўскага, "Літоўскае Палессе", "Беларускае Палессе" А. Кіркора, "Падарожжа па маіх былых ваколіцах" У. Сыракомлі), акцэнтавалася ідэя самабытнасці беларусаў і іх культуры. Некаторыя даследчыкі (Е. Раманаў, Д. Лапо) займаліся апрацоўкай вуснай народнай творчасці дзеля выяўлення этнапсіхалагічнага партрэта беларуса. На аснове кантамінацыі этнаграфічнага і мастацкага падыходаў з дапамогай аморфнага сюжэта, заяўленага назвай твора, падрабязна асвятляўся беларускі вясковы быт у творах "Дзяды. Нарыс з жыцця лепельскіх беларусаў", "Замайжанскі кірмаш. Беларускі эскіз", "Нарысы з жыцця беларускай вёскі", "Пілiпава вяселле. Беларускі нарыс", "Мікітавы хаўтуры. Нарыс з жыцця беларускіх сялян" А. Пшчолкі.

Калі ў першай палове XIX стагоддзя пісьменнікаў цікавілі пераважна вусная народная творчасць, духоўная культура беларусаў, то з другой паловы стагоддзя пад уздзеяннем эстэтыкі рэалізму і ідэй народніцтва значна больш увагі надавалася сацыяльнаму быту розных пластоў грамадства. Бытавы і сацыяльны стан беларускай вёскі мазаічна раскрываўся ў творах руска-беларускага празаіка Я. Брайцава, дзе народазнаўчы матэрыял далучаўся да сюжэтнай канвы праз трапныя аўтарскія характарыстыкі персанажаў і месца дзеяння. Этнаграфічныя дэталі выступалі мастацка-выяўленчым сродкам сацыяльнай і псіхалагічнай рэпрэзентацыі літаратурных герояў і гістарычнага часу ў польскамоўных творах пра нёманскі край Э. Ажэшка, у аповесці "Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта" В. Савіча-Заблоцкага. Аўтары колькасна нешматлікай беларускамоўнай прозы перш за ўсё імкнуліся ўвасобіць тагачасны сацыяльны партрэт суайчыннікаў. Так званыя мемуары "З папераў А. Абуховіча" ўтрымлівалі звесткі пра побыт і ўзаемадачыненні шляхты і сялянства, пра паэтычнасць нацыянальнага ўспрымання свету (раздзелы "Спас 20/VII 1894", "Дзяды"). У празаічнай спадчыне Ф. Багушэвіча лаканічныя замалёўкі парэформеннага часу занатоўвалі сацыяльнае становішча беларускай вёскі канца XIX стагоддзя (малазямелле, разбурэнне сялянскіх і дваранскіх "гнёздаў", развіццё маёмаснай дыферэнцыяцыі ў сялянскім асяроддзі).

Увага да побыту і культуры беларускага народа ў полілінгвістычнай айчыннай літаратуры XIX стагоддзя спачатку вынікала з уплыву рамантызму, потым ідэй народніцтва і пошукаў новых выяўленчых сродкаў падчас станаўлення рэалізму ў нацыянальнай літаратуры. Народазнаўчы модус – з'ява распаўсюджаная ў сусветным прыгожым пісьменстве XIX стагоддзя. Пераканаўчым доказам гэтага служаць кастумбрызм у іспанскай і іспанамоўных літаратурах Лацінскай Амерыкі (творчасць Р. дэ Месанера Раманаса, Р. Пальмы, Т. Караскільі), верызм у італьянскай літаратуры (творчасць Дж. Вергі, Л. Капуаны), звязаная з рухам "людаманства" польская проза ("На скалістым Падгаллі", "Казачны свет Татраў" К. Тэтмаера, "Батракі", "У далінах" У. Оркана, "Мужыкі" У. Рэйманта), этнаграфічны напрамак у рускай літаратуры 40–70-х гадоў (творчасць У. Даля, П. Мельнікава-Пячэрскага, Ф. Рашэтнікава і інш.). У айчыннай прозе народазнаўчы модус адметны не дэталёвым даследаваннем лёсу ці псіхалогіі беларусаў, а менавіта пафасам адкрыцця народа. Народазнаўчы матэрыял у творах празаікаў Беларусі XIX стагоддзя, у адрозненне ад старажытнага пісьменства, дзе дамінаваў пазнавальны план, значна часцей выкарыстоўваўся ў ролі выяўленчай. І хоць было дастаткова распаўсюджаным рэпрадуктыўна-эмпірычнае, але прыкметна пашыралася ініцыятыўна-творчае ўзнаўленне бытавых і сацыяльных рэалій, што ўказвае на якасны рост пісьменніцкага майстэрства, далучэнне айчыннай славеснасці да вызначальных шляхоў развіцця сусветнай літаратуры.

У падраздзеле **2.2 "Фарміраванне традыцыі мастацкага народазнаўства беларускімі празаікамі пачатку XX стагоддзя"** адзначаецца, што беларуская проза пачатку XX стагоддзя адчувала дзейсны ўплыў вуснай народнай творчасці, што многія аўтары з мэтай выяўлення ментальнасці суайчыннікаў і ў пошуку чытацкай аўдыторыі звярталіся да апрацоўкі фальклорных сюжэтаў. У такіх творах увага звычайна засяроджвалася на нейкім адзінкавым моманце існавання ці рысе характару асобы або народа (напрыклад, у "Трох грошах" Ніны Івановай – на ашчаднасці, практычнасці беларусаў, у "Лапцях" Янкі Лабатроса – на іх празмернай цярплівасці).

Этнаграфічна-бытавыя апісанні прысутнічалі фактычна ва ўсіх празаічных жанрах – ад пейзажных замалёвак да аповесцей і рамана – дзеля тыпізацыі характараў і абставін. Народазнаўчы матэрыял з выразнымі адзнакамі аўтарскага абагульнення з'яўляўся семантычна значнай структурнай адзінкай у шматлікіх творах, аснову якіх складаў матыў падарожжа ("Лісты з падарожы", "Думкі ў дарозе" Ядвігіна Ш., "З дарогі", "Успаміны з паездкі ў Фінляндыю" Цёткі).

Дамінантнай пісьменніцкай стратэгіяй паступова станавілася істотная трансфармацыя этнаграфічна-бытавой і фальклорнай першакрыніц. Паказальная ў сэнсе выбару ракурсаў даследавання народа і аўтарскіх падыходаў як шляхоў фарміравання нацыянальнай традыцыі ў выпрацоўцы спосабаў і прыёмаў мастацкага народазнаўства творчасць Я. Коласа, В. Ластоўскага, М. Гарэцкага. Я. Колас ішоў праз кароткія этнаграфічныя запісы да мастацка-канцэптуальнага асэнсавання жыцця і характару беларусаў. У "малой" прозе, у паэме "Новая зямля" ён даў высокамастацкія ўзоры глыбокага эстэтычнага спасціжэння нацыянальнага быцця праз быт. Этнаграфічна-бытавыя замалёўкі, трапныя этнаграфічныя дэталі, апрацоўка сюжэтаў народных паданняў у Коласа – важны элемент сацыяльна-бытавой і псіхалагічнай характарыстыкі персанажаў, неабходная частка цэласнага эпічнага адлюстравання жыцця па законах рэалістычнай паэтыкі. У творчасці В. Ластоўскага цэнтральнай была тэма складаных шляхоў айчыннай гісторыі і нацыянальнага самавызначэння беларусаў, пісьменніка цікавілі пытанні этнагенезу, духоўнага свету суайчыннікаў, якія асэнсоўваліся праз апрацоўку сюжэтаў народных казак, паданняў, праз паказ этнаграфічна-побытавых рэалій, што набывалі іншасказальнасць, выконвалі галоўным чынам сэнсава-генератыўную функцыю. Мастацкае народазнаўства ў прозе Ластоўскага выступала прадуктыўным сродкам рамантызаванай рэканструкцыі мінулага, выяўлення патрыятычных пачуццяў аўтара, абагульнення жыццёвых з'яў дзеля сцвярджэння, як гэта зроблена ў аповесці "Лабірынты", цеснай сувязі беларускай гісторыі і культуры з сусветнай. Эстэтычная праграма М. Гарэцкага заключалася ў выяўленні, па словах самога пісьменніка, "шчыра беларускага" праз творчае засваенне не толькі іншанацыянальнага літаратурнага вопыту, але

і фальклорна-міфалагічнай спадчыны дзеля ідэйна-мастацкага абнаўлення айчыннай прозы, інтэлектуалізацыі і псіхалагізацыі аповеду. Шырокае ўзнаўленне этнаграфічных пластоў у Гарэцкага – усвядомлены прыём аўтарскай рэфлексіі, звязанай са спасціжэннем вытокаў і сутнасці характару беларусаў. Засяроджанасць празаіка на ментальнасці суайчыннікаў у ранніх творах прывяла да артыкуляцыі пісьменнікам улады "патаёмнага" ў душы беларуса. З дапамогай народазнаўчага матэрыялу М. Гарэцкі раскрываў свой ідэал вартага чалавека жыцця, этнаментальнасць беларусаў, абумоўленую кантамінацыяй язычніцкага і хрысціянскага пачаткаў у іх свядомасці.

М. Гарэцкі разам з Цёткай і В. Ластоўскім стаў пачынальнікам увасаблення іншанацыянальных характараў у айчыннай прозе XX стагоддзя. "Іншыя" (немцы, яўрэі, рускія, палякі, літоўцы, украінцы, амерыканцы) Гарэцкім звычайна паказваліся вачамі беларусаў, у выніку суайчыннікі пісьменніка яшчэ дадаткова ментальна самахарактарызаваліся як асобы і прадстаўнікі этнасу. Этнаграфічна-побытавыя дэталі, выказванні персанажаў пра свой і іншы народ накіроўваліся М. Гарэцкім не на фіксацыю вонкавых праяў іншанацыянальнага свету, а ў рэчышча інтэлектуальных рэфлексій дзеля пазнання сутнасных рыс характару свайго ўласнага народа праз кампаратыўны ракурс.

Мастацкае народазнаўства ў беларускай прозе гэтага часу вынікала з патрыятычна-адраджэнскіх, асветніцкіх і ўласна творчых задач, падпарадкоўвалася выхаванню нацыянальнай самасвядомасці суайчыннікаў, а эстэтызацыя пісьменнікамі побыту выпрацоўвала сістэму выяўленчых сродкаў, садзейнічала фарміраванню рэлевантных адзнак нацыянальнага празаічнага стылю, дзе значнае месца адводзілася даследаванню быту як праявы быцця, як дэтэрміпанта светаадчування суайчыннікаў. Запозненае станаўленне новай беларускай прозы абумовіла феномен своеасаблівай эстэтычнай эклектыкі, калі ў творчасці адных і тых жа пісьменнікаў перапляталіся элементы паэтыкі розных мастацкіх метадаў: напрыклад, у Цёткі, М. Гарэцкага, З. Бядулі – рэалізму, рамантызму, мадэрнізму. Роля народазнаўчага матэрыялу ў структуры кожнага метаду пачатку XX стагоддзя спецыфічная: у рэалістаў тыпізаваліся абставіны і характары, ствараласяўражанне непасрэднай плыні жыцця (творы Я. Коласа); у тых аўтараў, што эпізадычна звярталіся да рамантычнай паэтыкі, праз элементы мастацкага народазнаўства акцэнтаваліся непаўторнасць нацыянальнага свету (проза К. Каганца), недасканаласць рэчаіснасці ("Лірныя спевы" М. Гарэцкага, "Абразкі" З. Бядулі); у прыхільнікаў мастацкіх прынцыпаў мадэрнізму метафарызаваўся паказ рэчаіснасці ("Пяюць начлежнікі" З. Бядулі, "Нарадзіны", "Краскі" В. Ластоўскага, "Асеннія лісты" Цёткі). У пачатку мінулага стагоддзя склаліся асноўныя падыходы да эстэтычнай трансфармацыі айчыннымі аўтарамі народазнаўчай першаасновы,

найбольш ярка прадстаўленыя ў творчасці Я. Коласа (паслядоўнае даследаванне быцця праз быт), В. Ластоўскага (рамантызаваная паэтызацыя мінулага і проціпастаўленне яго сучаснасці, сімвалізацыя побытавых з'яў), М. Гарэцкага (псіхалагічна-аналітычнае асэнсаванне нацыянальнага характару і рэчаіснасці).

У падраздзеле **2.3 "Акцэнтацыя гістарычна-часавага і нацыянальна-ментальнага ў празаічных творах 20-х гадоў"** даказваецца, што на агульную настроенасць мастацкага народазнаўства аказвала ўплыў усведамленне пісьменнікамі памежнасці гістарычнага часу. У 1920-я гады адбывалася імклівае станаўленне рамана, з'явіліся розныя жанрава-стылёвыя формы аповесці, развіваўся падарожны нарыс, у цэнтры якога звычайна знаходзілася беларуская сацыяльна-бытавая канкрэтыка: знешні выгляд, вопратка, заняткі, светаадчуванне жыхароў, мінулае і сучаснае гарадоў і мястэчак, прырода і г.д. Народазнаўчы матэрыял рэпрадуктыўна-эмпірычнага ўзроўню садзейнічаў не толькі паказу беларускага краю ("1200 вёрст па Беларусі" М. Чарота, "10 дзён падарожжа па Беларусі" З. Бядулі), але выконваў агітацыйна-ідэалагічную ролю ("У глыбі Беларусі" Ц. Гартнага, "На мяжы" А. Александровіча), даваў багатую інфармацыю для роздуму над гістарычнымі перспектывамі Беларусі і яе культуры ("Падарожжа на новую зямлю" М. Зарэцкага).

Пісьменнікі адбіралі і ўводзілі ў творы народазнаўчы матэрыял па законах рамантычнай ці рэалістычнай паэтыкі. Развіццё рамантычнай плыні было цесна звязана з творчасцю М. Лынькова, М. Зарэцкага, В. Каваля, часткова З. Бядулі, у якіх пераважаў суб'ектывізаваны тып паказу народнага свету. Народазнаўчы матэрыял у творах М. Лынькова – гэта галоўным чынам метафарычныя па стылі пейзажныя замалёўкі, якія характарызавалі не столькі ландшафт, колькі светабачанне героя; стылізацыі пад народныя паданні, дзе ў духу часу гучалі матывы класавага антаганізму, маральнага процістаўлення працоўных эксплуататарам ("Воўчы лог", "Апошні зверыядавец" і інш.). М. Зарэцкага цікавіла псіхалагічнае аблічча яго сучаснікаў, з фальклорных і этнаграфічна-бытавых пластоў пісьменнік выбіраў тое, што адпавядала яго асабістаму рамантычнаму светаадчуванню і бунтарнаму духу часу. Акцэнт ставіўся на паказе незвычайнага ў народных уяўленнях, праз якія рэалізавалася характаратворчая функцыя народазнаўчага матэрыялу, асабліва ў рамане "Сцежкі-дарожкі", апавяданні "Ракавыя жаронцы". В. Каваль, празаік, у стылі якога перапляталіся рамантычныя і рэалістычныя рысы з элементамі імпрэсіяністычнага пісьма, падкрэсліваў амбівалентнае ўздзеянне паўсядзённасці на характар чалавека. Першыя творы В. Каваля ("Буй-вецер", "Пра кветку «брат-сястра»") – стылёвая імітацыя народных казак і паданняў, напоўненая рэмінісцэнцыямі з сучаснасці дзеля паэтызацыі вечнага народнага імкнення да шчасця і справядлівасці. У якасці эпіграфаў да твораў пісьменнік часта браў

радкі з народных песень, каб сімвалічна пазначыць ход сюжэта, больш экспрэсіўна выявіць ідэю твора ("Як вясну гукалі", "Сяльчане" і інш.). Разгорнутыя апісанні вясковага быту, народных звычаяў дазвалялі В. Кавалю паказваць беларускую вёску пераходнага часу без сацыялагізаванай інвектыўнасці і сентыментальнай ідэалізацыі. Народазнаўчы матэрыял у прозе З. Бядулі апрацоўваўся шляхам спалучэння прыёмаў паэтыкі рэалізму, рамантызму і мадэрнізму. Праз эскізныя апісанні сялянскага быту ў ранніх творах (зборнік "Абразкі") пісьменнік адзначаў варожасць рэчаіснасці чалавеку паэтычнай душы, у апавяданнях пачатку 20-х гадоў ("Дванаццацігоднікі", "На зачараваных гонях") акцэнтаваў працавітасць, нацыянальную талерантнасць, цярплівасць, пачуццё чалавечага гонару як вызначальныя рысы характару працоўных беларусаў. Плакатна завостраныя аўтарам малюнкі сацыяльнага побыту розных пластоў грамадства ў прыгодніцкай па змесце і рамантычнай па стылі аповесці "Салавей" набывалі парадыйна-іншасказальны характар, а ў сатырычным рамане "Язэп Крушынскі" факусіравалі супярэчлівасць свядомасці людзей памежнага часу. Функцыянальная семантыка народазнаўчага матэрыялу надавала названым творам філасофскі падтэкст, латэнтную палемічнасць у адносінах да сучаснасці і ўскладняла жанравую ідэнтыфікацыю.

У прозе прадстаўнікоў рэалістычнай плыні пераважала ўключэнне народазнаўчага матэрыялу аб'ектывізаванага і сімбіятычнага тыпаў з эстэтычнай устаноўкай на максімальную жыццёвую дакладнасць. Тыпалагічна блізкімі па ўвасабленні этнаграфічна-бытавых рэалій былі творы Ц. Гартнага і П. Галавача, дзе мастацкае народазнаўства падначальвалася выяўленню сацыяльнай сутнасці абставін і чалавека, пры паказе якіх абодва пісьменнікі пазбягалі этнаграфічнай дэталізацыі. Побытавыя бакі рэчаіснасці як характэрная праява зменлівага нацыянальнага свету прыцягвалі ўвагу К. Крапівы і Я. Нёманскага. "Малая" проза К. Крапівы вылучалася вострай сатырычнай і гумарыстычнай накіраванасцю, камічны эфект у яго апавяданнях ствараўся перакадзіроўкай традыцыйнага беларускага быту на мову газетных перадавіц (замалёўка "Вясна"). Набыткі "нашаніўскай" прозы ў эпічным асэнсаванні быцця праз быт, спалучаныя з элементамі сацыялагізаванай заладзенасці характараў і этнаграфічных малюнкаў, знайшлі выразны адбітак у творах Я. Нёманскага першай паловы 20-х гадоў, потым пад уздзеяннем часу мастацкае народазнаўства ў эпасе пісьменніка стала развівацца ў бок плакатнай абмалёўкі персанажаў (раман "Драпежнікі").

Цікавасць да лёсу этнаментальнага ў пераходны час – вызначальная рыса прозы пісьменніка эталагічнага складу Л. Калюгі, у творчай манеры якога побытавая канкрэтыка сінтэзавалася з метафарычнымі абагульненнямі. У апавяданнях, аповесці "Ні госць ні гаспадар", насычаных гумарыстычна пададзенымі аўтарам этнаграфічна-бытавымі падрабязнасцямі, акцэнтаваліся

ідэі разнастайнасці народных характараў і самакаштоўнасці асобы. Паступовае ўмацаванне стваральна-пошукавага стаўлення пісьменніка да этнаграфічнай першаасновы яскрава выявілася ў аповесці "Нядоля Заблоцкіх", дзе народны жарт пра Заблоцкага, які хацеў, але не змог разбагацець на мыле, станавіўся ідэйным і кампазіцыйным стрыжнем жыццёвых гісторый носьбітаў дастаткова тыповых рыс беларускага характару, метафарычна падагульняў пошукі шчасця суайчыннікамі Л. Калюгі ў пачатку мінулага стагоддзя.

Проза К. Чорнага адлюстроўвала быт як праяву нацыянальнага быцця і сфарміраваныя ім рысы чалавечага характару праз кантамінацыю лірызму, эпічнасці і аналітычнасці. Традыцыйны ўклад народнага жыцця для Чорнага – спачатку аб'ект нейтральнай эстэтычнай канстатацыі ці высмейвання, а потым паказ праяў беларускай рэчаіснасці станавіўся прыступкай для спасціжэння складанай сувязі агульначалавечага і нацыянальнага. У рамане "Сястра" гарадскі і вясковы быт празаікам пададзены як асноватворная крыніца варыянтнасці псіхалагічных тыпаў характару суайчыннікаў. Панарамны вобраз вёскі 20-х гадоў у рамане "Зямля" Чорным асацыятыўна экстрапаляваўся на тагачаснае беларускае грамадства. Тут пісьменнік раскрыў быційныя асновы жыцця беларусаў як земляробчай нацыі, дзе вызначальнымі каардынатамі выступалі зямля, родны кут, сям'я. Гармонія сялянскага свету, заснаваная на дыхатаміі жыцця і смерці, кампазіцыйна падкрэслівалася падборам этнаграфічных малюнкаў: радзіны Сабастыянавага ўнука – пахаванне жонкі Мацвея – вяселле Ганны з каморнікам – пахаванне Тамаша – жаніцьба Алеся. Народазнаўчы матэрыял у раманах Чорнага выступаў не толькі сродкам абагульнення жыццёвых з'яў, але і артыкуляваў аўтарскае разуменне складанасці праяў нацыянальнай рэчаіснасці.

Мастацкае народазнаўства ў беларускай прозе ажыццяўлялася ва ўмовах полікультурнасці і полілінгвізму. Аўтары, якія пісалі творы на ідыш, рускай і польскай мовах, перш за ўсё ўзнаўлялі гістарычныя падзеі свайго часу, на нацыянальную прыналежнасць герояў указвалі галоўным чынам толькі імёны і прозвішчы. Пераважная большасць беларускіх аўтараў 1920-х гадоў даследавала лёс менавіта свайго народа, аднак у шэрагу апавяданняў Лынькова паказваліся жыццё і побыт яўрэяў, у апавяданнях "Ілька" Каваля і "Пачуцці" Чорнага – цыган. На адлюстраванне іншанацыянальных рэалій моцны адбітак накладвалі ступень аўтарскага знаёмства з імі, ідэалагічныя пастулаты часу (апавяданні "Гой", "У мястэчку", "Гома" М. Лынькова, "Ілька" В. Каваля), уплыў рускай класічнай літаратуры ("Пачуцці" К. Чорнага). Тады яшчэ не страцілі сваёй актуальнасці і закладзеныя пісьменнікамі пачатку XX стагоддзя традыцыі даследаваць праз чужое этнаментальнае сваё, ацэньваць чалавека на падставе маральных крытэрыяў, а не сацыяльнай прыналежнасці, але паступова набывала моц лінія вызначэння

этычнага патэнцыялу асобы ў залежнасці ад класавага паходжання, якая трывала ўсталюецца ў айчыннай літаратуры да сярэдзіны 1980-х гадоў.

Празаікі 20-х гадоў імкнуліся перадаць неадназначныя суадносіны старога і новага ў народным побыце і свядомасці, сямейных і грамадскіх адносінах, акцэнтуючы ў залежнасці ад творчых задач прадметны або сэнсавы план у адлюстраваных імі жыццёвых з'явах.

Беларуская проза першай трэці XX стагоддзя ў галіне мастацкага народазнаўства прайшла шлях ад эмпірычнага ўзнаўлення рэалій народнага жыцця да спроб яго глыбокага эстэтычнага асэнсавання. Сацыяльна-бытавая сфера і чалавек у ёй сталі цэнтральнымі аб'ектамі пісьменніцкага даследавання, якое грунтавалася найперш на матэрыяле сялянскага свету, дзе захавалася шмат рэліктавых рыс. Народазнаўчы матэрыял у творах яшчэ не набыў стабільнай жанравай замацаванасці. Хоць рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці пераважала, але ўвасабленне пісьменнікамі народнага свету і характараў больш адпавядала рамантычным прынцыпам, паколькі, з аднаго боку, наглядалася пэўная паэтызацыя роднага краю і яго насельнікаў, а з другога боку і ў значна большай ступені – свядомае завастрэнне аўтарамі негатыўных з'яў у народным жыцці, праз якое акцэнтавалася неабходнасць удасканалення нацыянальнай рэчаіснасці. У творчасці майстроў мастацкага слова дамінаваў народазнаўчы матэрыял аб'ектывізаванага тыпу, сацыяльнага і бытавога відаў з функцыямі культуралагічнай і характаратворчай, бо эстэтычная рэпрэзентацыя беларуса папярэдняму заставалася адной з галоўных задач прозы.

Трэці раздзел "**Семантыка-аксіялагічная спецыфіка мастацкага народазнаўства ў беларускай прозе 30-х – першай паловы 50-х гадоў**" складаецца з трох падраздзелаў.

У падраздзеле **3.1 "Функцыянальна-сэнсавая амбівалентнасць народазнаўчага матэрыялу ў прозе 30-х гадоў"** падкрэсліваецца, што тэндэнцыя да ўзмацнення палітызаванасці станавілася сэнса- і структураўтваральным модусам прозы дадзенага перыяду, а ідэалагічныя ўстаноўкі часу дыктавалі пісьменнікам неабходнасць рэдукцыі праблемнага поля мастацкага народазнаўства, паколькі цэнтральнае месца ў творчасці аўтараў заняў паказ рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, калгаснага жыцця, сацыялістычнага будаўніцтва. Асноўнымі жанрамі ў прозе сталі падарожны нарыс, апавяданне, аповесць, развіваўся раман; панавалі прынцыпы адлюстравання рэчаіснасці, заснаваныя на строгай ідэалагічнай нарматыўнасці. Падарожныя нарысы, як сведчыць аналіз змешчанага ў іх народазнаўчага матэрыялу, былі не аналітычнымі, а фактаграфічна-ілюстрацыйнымі і фактаграфічна-агітацыйнымі, што з'яўлялася канцэнтраваным адбіткам агульных тэндэнцый у тагачасным мастацтве слова. Тэматычна і кампазіцыйна падарожныя нарысы, асабліва ў зборніках "На сонечным шляху", "Каласіцца зямля" В. Станэўскага, "Крокі

пяцігодкі" Ю. Лявоннага, дастаткова аднастайныя: там расказвалася пра падарожжа ў новую сацыялістычную рэчаіснасць, а праз мастацкі этнаграфізм ілюстраваўся тэзіс аб пераўтварэнні жыцця на карысць чалавека, аб росце калектывісцкіх настрояў.

Ва ўмовах полілінгвізму 30-х гадоў празаікі, якія пісалі на ідыш, польскай, літоўскай мовах, звычайна расказвалі пра прадстаўнікоў тых сацыяльных пластоў, што найбольш ярка рэпрэзентавалі працоўных іх нацыянальнасці: палякі – пра парабкаў ці сялян, літоўцы – пра сялян, яўрэі – пра рамеснікаў. Эстэтычны патэнцыял мастацкага народазнаўства ў творах польскіх, літоўскіх, яўрэйскіх пісьменнікаў Беларусі вызначаўся ўзроўнем таленту, а пазнавальны – жыццёвым вопытам аўтараў. Вобразы беларусаў і беларускай рэчаіснасці ў такіх творах, як правіла, мелі ілюстрацыйны характар, акцэнтавалі ідэі пралетарскага інтэрнацыяналізму, адзінства памкненняў працоўных свету. Варта адзначыць пэўнае падабенства на грунце магістральнай арыентаванасці мастацкага народазнаўства ва ўмовах полілінгвізму 1930-х гадоў у прозе Беларусі і Швейцарыі, якое заключалася ў тым, што ў абедзвюх еўрапейскіх краінах творчасць канкрэтнага пісьменніка падтрымлівала яго ўласную і падкрэслівала іншую нацыянальную і эстэтычную ідэнтычнасць.

Спадчына мінулага, рэліктавыя з'явы ў народным побыце і свядомасці, паводле тагачаснай літаратурна-метадалагічнай канцэпцыі, азначалі кансерватыўнасць, адсталасць пэўнай часткі грамадства (звычайна сялянства, асабліва прадстаўнікоў яго старэйшага пакалення), праз развянчанне старога ў творах даказвалася правамернасць перабудовы жыцця на сацыялістычны лад. Паказ традыцыйнага бытавога ўкладу, звычаяў, абрадаў у прозе гэтага перыяду часта выступаў сродкам негатыўнай сацыяльна-класавай характарыстыкі асобы. Творы, заснаваныя на дэталёвым даследаванні псіхалагічнай і сацыяльнай абумоўленасці характараў, на эпізацыі народнага свету ("На чырвоных лядах" М. Лынькова, "Мядзведзічы" К. Крапівы), засталіся не закончанымі, бо эстэтычныя прынцыпы іх аўтараў мала ўпісваліся ў афіцыйную парадыгму мастацкасці. Палемічнымі да ідэалагічных патрабаванняў таго перыяду адносна літаратуры былі аповесці "Адшчапенец" і "Дрыгва" Я. Коласа, вытрыманыя ў стылі арганічных для пісьменніка прынцыпаў паслядоўнага даследавання быцця праз быт, псіхалагічнай дэтэрмінацыі характараў.

Важкі ўклад у мастацкае народазнаўства ўнёс К. Чорны, у творчасці якога агульначалавечае спасцігалася праз нацыянальнае, а нацыянальнае – праз распрацоўку фундаментальных філасофскіх і маральна-этычных праблем: сэнс чалавечага жыцця, Бацькаўшчына, сям'я, шчасце, багацце, уласнасць. Вымушаная знешняя ілюстрацыйнасць у паэтыцы Чорнага кампенсавалася іншасказальнасцю этнаграфічна-бытавых пластоў, народазнаўчага ракурсу ўвогуле. Так, безыменны кажушны кравец у "Трэцім пакаленні" выступае ўвасабленнем лёсу беларуса

першай паловы XX стагоддзя: жыццё краўца складвасцца нібыта шчасліва, у новы час ён ужо не вандруе па свеце ў пошуках работы, а стала працуе на будоўлі, яго дзеці атрымалі добрую адукацыю, але раней чалавек быў гаспадаром, меў сваю, хоць і бедную хату, якую разбурылі пры будаўніцтве электрастанцыі, і кравец з гаспадара імгненна ператварыўся ў кватаранта.

Мастацкае народазнаўства па экстралітаратурных прычынах не магло адкрыта паўнавартасна выконваць пазнавальную ролю, аднак узнаўленню праўдзівага партрэтнага малюнка рэчаіснасці садзейнічала "двухгалосая" (па тэрміналогіі М.М. Бахціна) мадэль мастацкага слова ў этнаграфічна-бытавых апісаннях і дэталях. Рэаліі народнага жыцця ў творах таленавітых аўтараў 30-х гадоў набывалі сэнсава-функцыянальную амбівалентнасць за кошт латэнтнай крыптаграфіі ("Адшчапенец" Я. Коласа, "Трэцяе пакаленне" К. Чорнага, "Сярэбраная табакерка" З. Бядулі).

У падраздзеле **3.2 "Паэтызацыя духоўных каштоўнасцей народа пісьменнікамі перыяду Вялікай Айчыннай вайны"** даводзіцца, што месца і роля мастацкага народазнаўства ў прозе ваеннага часу вынікалі з новай накіраванасці эстэтычнага асэнсавання рэчаіснасці і чалавека, бо барацьба з фашызмам стала сэнсава значным момантам адлюстравання нацыянальнага свету ў беларускай літаратуры. Этнаграфічна-бытавыя і пейзажныя малюнкі прысутнічалі пераважна ў творах, якія расказвалі пра людзей, што апынуліся ў тыле ворага. Часта ў пошуках яркіх выяўленчых сродкаў празаікі звярталіся да паэтыкі фальклору, пры гэтым сюжэты і героі міфаў, легендаў, казак беларускімі аўтарамі механічна не пераносіліся ў творы, а запазычаліся толькі паасобныя прыёмы з вуснай народнай творчасці, перш за ўсё гіпербалізацыя сілы духу змагароў з фашызмам, гратэскавы паказ ворагаў. Айчынныя пісьменнікі ў перыяд вайны вярнулі ў літаратуру і апаэтызавалі вобраз чалавека-патрыёта, у многім забыты аўтарамі 1930-х гадоў, якія прыўзносілі інтэрнацыяналізм.

Адкрыцці мастацкага народазнаўства ў беларускай ваеннай прозе найперш звязаны з творчасцю К. Чорнага, які перайшоў ад вострa публіцыстычнага на пачатку вайны паказу гераізму беларусаў да філасофска-аналітычнага асэнсавання іх характару ў аповесцях "Скіп'ёўскі лес", "Заўтрашні дзень", раманах "Пошукі будучыні", "Млечны шлях", "Вялікі дзень". Узноўленая пісьменнікам беларуская этнаграфічна-бытавая канкрэтыка (хата, працоўныя заняткі, гаспадарчыя прылады, пейзаж) у раманах ваеннага часу садзейнічала стварэнню інтэгральных вобразаў, універсальных па сваёй мастацкай і філасофскай семантыцы, актуалізацыі такіх нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, як Радзіма, дом, сям'я. У парабалічным па змесце і форме рамане "Пошукі будучыні" К. Чорны адлюстраваў мадэль нацыянальнага быту і быцця ў межах лакальна абмежаванай тэрыторыі, дзе

этнаграфічна-побытавыя малюнкі найперш выконвалі сэнсава-генератыўную функцыю: вёска на Вялікім Скрыжаванні станавілася метафарычным увасабленнем Беларусі, папсаваная брама каля хаты старога Нявады перад першай сусветнай вайной і некім адчыненая брама каля хаты Кастуся Лукашэвіча ў час Вялікай Айчыннай вайны – сімвалічным абазначэннем небяспекі, нашэсця ворагаў. Праз узнаўленне паўсядзённасці і прыватных чалавечых лёсаў у часавай дынаміцы К. Чорны імпліцытна і эксплііцытна падкрэсліваў адзінства і пераемнасць беларускай гісторыі, у якой людзі пастаянна вымушаны даказваць сваё права на свабоду і шчасце.

Выкарыстанне народазнаўчага матэрыялу ў ідэйна-змястоўным плане дапамагала пісьменнікам паказаць чалавека ў драматычных абставінах вайны, падкрэсліць натуральнасць для людзей не ваеннага, а мірнага існавання, апаэтызаваць патрыёта-змагара, вялікую і малую радзіму беларусаў, а ў плане наратыўным – паглыбіць семантыку аповеду за кошт алегарычнасці пададзеных аўтарамі малюнкаў стваральнага мірнага жыцця. Проза ваеннага часу звярнула ўвагу на эстэтычную і этычную аксіялогію этнаграфічна-бытавой спадчыны. Адлюстраванне беларускай прыроды, традыцыйнага сялянскага побыту, звычаяў мела на мэце сцвердзіць, што народ, які мае багатыя гістарычныя карані, здольны выстаяць і перамагчы фашысцкую навалу.

У падраздзеле **3.3 "Сацыяльная ангажаванасць мастацкага народазнаўства як ідэйна-выяўленчы імператыў прозы першага пасляваеннага дзесяцігоддзя"** на падставе грунтоўнага аналізу літаратурных твораў робіцца вывад, што проза гэтага перыяду знешне развівала, але па сутнасці не паўтарала лінію мастацкага народазнаўства 1930-х гадоў. Празаікі даследавалі чалавека грамадскага, таму ў творах праз этнаграфічна-бытавыя і пейзажныя малюнкі перш за ўсё вымяраліся маральныя якасці ўдзельніка вытворчага працэсу, паэтызаваліся народныя традыцыі, звязаныя з працоўнай дзейнасцю (уваходзіны, талака, зажынкі, дажынкі, засеўкі і інш.). Пісьменнікі засяроджваліся пераважна на святочных момантах жыцця людзей, каб прывесці чытача да думкі аб непазбежнасці надыходу лепшых часоў. Праз мастацкі этнаграфізм празаікі параўноўвалі старое і новае, артыкулявалі пазітыўныя змены ў рэчаіснасці і даказвалі такім чынам упэўнены рух грамадства ў светлае будучае. Народазнаўчы матэрыял у першую чаргу характарызаваў сацыяльнае і прафесійнае аблічча, радзей – акрэсліваў сутнасць характару персанажаў ці пазначаў развіццё падзей. Так, у аповесці Т. Хадкевіча "Вяснянка" лірыка-сімвалічная назва твора суадносілася з характарам галоўнай гераіні і аўтарскім аптымістычным бачаннем будучыні.

Практычна аксіяматычным у літаратуразнаўстве стала сцвярджэнне пра згладжванне прозай гэтага часу сацыяльных канфліктаў, пра яе строгае падпарадкаванне так званай "тэорыі бесканфліктнасці". Адзначаныя рэчы мелі

месца ў пісьменніцкай працы, але пры разглядзе літаратурнага працэсу нельга не ўлічваць сацыяльна-гістарычных умоў развіцця слоўнага мастацтва, імператываў, якімі кіраваліся аўтары таго перыяду: на творцаў моцна ўплывала агульная атмасфера часу, напоўненая эйфарыяй ад перамогі над фашызмам. Пад уздзеяннем такіх грамадскіх настрояў у літаратуры назіраліся рамантызацыя народа, які прадстаўлены ў абліччы мужнага воіна або нястомнага будаўніка светлага заўтра, магутны "ідылічны" і "футураспекцыйны" ўсплёскі; паказ не столькі таго, што было і ёсць на самай справе, колькі таго, што павінна было быць і абавязкова будзе.

Празаікі 30-х – першай паловы 50-х гадоў XX стагоддзя аддавалі перавагу даследаванню сацыяльнага і маральнага аблічча сваіх сучаснікаў праз народазнаўчы матэрыял аб'ектывізаванага тыпу. Функцыі народазнаўчага матэрыялу былі неаднародныя. Пэўнае тыпалагічнае падабенства, на першы погляд, выяўлялася ў творах 1930-х гадоў і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, дзе роля этнаграфічна-бытавых малюнкаў пад уплывам нарматыўнай эстэтыкі сацрэалізму, як правіла, знешне звужалася да арнаментальнасці, ілюстрацыі ідэй сацыяльнага прагрэсу, дзе абмяжоўваўся народазнаўчы план. Аднак у творах таленавітых пісьменнікаў у 1930-я гады праз сэнсава амбівалентнае адлюстраванне народнага побыту выяўлялася сутнасць гістарычнага часу, а ў прозе першага пасляваеннага дзесяцігоддзя можна заўважыць латэнтную палеміку з сучаснай аўтарам рэчаіснасцю, якой пісьменнікі фактычна процістаўлялі дасканалы ідэацыйны свет. Увагу мастакоў слова прыцягвалі сацыяльны быт і быццё сучасніка; асноўнымі функцыямі народазнаўчага матэрыялу сталі культуралагічная і характаратворчая, рэдукаваныя пад уплывам нарматыўнай эстэтыкі сацрэалізму. Проза ваеннага часу па ідэйна-змястоўнай накіраванасці мастацкага народазнаўства набліжалася да айчыннай літаратуры XIX стагоддзя і часткова прозы пачатку XX стагоддзя, паколькі значнае месца ў ёй займала паэтызацыя чалавека-патрыёта, роднага кута, сям'і, мірнага жыцця і працы як спрадвечных народных каштоўнасцей.

Чацвёрты раздзел "**Паглыбленае спасціжэнне нацыянальнага свету і чалавека: мастацкае народазнаўства ў прозе другой паловы 50-х гадоў – канца XX стагоддзя**" складаецца з двух падраздзелаў.

У падраздзеле **4.1 "Усебаковае асэнсаванне вытокаў і перспектыў нацыянальнага характару пісьменнікамі другой паловы 50-х – сярэдзіны 80-х гадоў"** заўважаецца, што ў творчасці айчынных празаікаў істотна пашырыўся праблемна-тэматычны спектр мастацкага народазнаўства, адной з асноўных ліній яго стала ўсебаковае асэнсаванне пройдзенага беларусамі гістарычнага шляху, народных традыцый, узмацнілася дыферэнцыяцыя ў выкарыстанні этнаграфічнага матэрыялу, які трывала замацаваўся ў падарожных

нарысах, гістарычнай і "вясковай" прозе рэтраспектыўнага характару. Вобразная структура, прадметны свет падарожных нарысаў засведчылі тэндэнцыю да поліфункцыянальнасці ў іх элементаў мастацкага народазнаўства, да далейшай белетрызацыі нарысавай формы ("Дзівасіл" В. Палтаран, "Званы ў прадоннях азёр" У. Караткевіча і інш.).

Рэтраспектыўнае асэнсаванне народнага жыцця, выяўленне ў мінулым беларусаў надзённага для сучаснасці пачало ўмацоўвацца з раманаў "Засценак Малінаўка" А. Чарнышэвіча, "На парозе будучыні", "Гарадок Устронь" М. Лобана, твораў У. Караткевіча. Раман "Засценак Малінаўка" па-свойму наватарскі: тут насуперак сацыялагічным схемам праз дэталёвае адлюстраванне геаграфічна-этнаграфічных асаблівасцей Случчыны, быту шляхецкага засценка, сялян, рамеснікаў, парабкаў выказвалася думка, што Беларусь у пачатку мінулага стагоддзя была не толькі сялянскім, але і шляхецкім краем, што шляхецкае саслоўе маёмасна і маральна – з'ява далёка не адназначная. Прынцыпова новымі ў параўнанні з творамі іншых аўтараў сталі энцыклапедычныя ў плане эстэтычнай рэканструкцыі і асэнсавання быцця і быту беларусаў на працягу іх шматвяковай гісторыі аповесці і раманы У. Караткевіча. Мастацкае народазнаўства – адна з вызначальных прыкмет караткевічаўскай паэтыкі, арыентаванай на актуалізацыю нацыянальна-патрыятычнай праблематыкі праз выкарыстанне вопыту сусветнай прыгодніцкай літаратуры і беларускай этнаграфічнай экзотыкі. Яно было ідэйна і сюжэтна матывавана імкненнем аўтара да паэтызацыі роднага краю, абуджэння і захавання гістарычнай памяці яго насельнікаў. Свет беларускай рэчаіснасці ў творах Караткевіча – вынік не люстранога, рэпрадуктыўнага ўзнаўлення этнаграфічна-гістарычных фактаў, а плён узаемадзеяння іх з канцэптуальна падмацаваным ідэяй патрыятычнага выхавання суайчыннікаў, рамантызаваным асобасна-аўтарскім бачаннем мінулага.

Значным эстэтычным адкрыццём у сферы мастацкага народазнаўства стаў раман І. Мележа "Людзі на балоце". Матэрыялам для асэнсавання пісьменнікам было абрана жыццё палешукоў у пераломны, гістарычна і псіхалагічна складаны момант. Шырокая панарама народных характараў, побыту, схопленых Мележам у дынаміцы, – адна з істотных праяў эпічнасці і індывідуальна-аўтарскіх адзнак мастацкага народазнаўства ў рамане. Багаты этнаграфічны матэрыял у "Людзях на балоце" сюжэтна і ідэйна канструктыўны, полівалентны: ён задзейнічаны ў змесце апавядання, у характарыстыцы і мове персанажаў. Дзякуючы гэтаму Мележ здолеў перадаць субстанцыянальнасць побыту і светабачання беларусаў. Прынцыповае наватарства празаіка ў "Людзях на балоце" заключалася ў тым, што да этнаграфічна-бытавых пластоў у рэгіянальным варыянце ён дадаў традыцыйную раманную схему, заснаваную на перапляценні вострых грамадскіх і любоўных калізій. Ступень прысутнасці этнаграфічна-бытавых малюнкаў у наступных раманах "Палескай хронікі" паступова зніжалася, што абумоўлівалася

ідэйна-тэматычным і кампазіцыйным адзінствам твораў, а не толькі ростам пісьменніцкага майстэрства, як гэта нярэдка трактуецца беларускімі літаратуразнаўцамі.

Прыёмы і сродкі мастацкага народазнаўства мелі пэўныя адрозненні ў творчасці прадстаўнікоў выразна абазначаных з 60-х гадоў лірычнай і эпічнай стылёвых плыней. Развіццё лірычнай плыні звязана з творчасцю Я. Брыля, М. Стральцова, Я. Сіпакова. Народазнаўчы матэрыял там суб'ектыўна афарбаваны, звычайна пададзены праз рэфлексію героя-апавядальніка; стылёвыя адрозненні паміж прадстаўнікамі лірычнай плыні назіраліся ў выкарыстанні відаў і функцый народазнаўчага матэрыялу ў структуры твораў. У Брыля ён складаецца з малюнкаў і дэталей адыходзячага ці адышоўшага святочнага і паўсядзённага народнага побыту, народнай фразеалогіі, "гаваркіх" слоў, выконвае культуралагічную, характаратворчую, сэнсава-генератыўную функцыі; у М. Стральцова прадстаўлены пераважна апісаннямі паўсядзённага побыту, беларускіх пейзажаў, вызначаецца шматслойнай семантычнай структураванасцю, багатай асацыятыўнасцю, засяроджанасцю на маральна-філасофскай праблематыцы, перадае дынаміку пачуццяў апавядальніка; у Я. Сіпакова адметны меладраматычным па танальнасці апісаннем традыцыйнага вясковага побыту галоўным чынам з настальгічным ці з гумарыстычным адценнем у ролі культуралагічнай, радзей – сэнсава-генератыўнай.

Агульная рыса мастацкага народазнаўства ў прадстаўнікоў дастаткова шматлікай эпічнай плыні заключаецца ў тым, што пісьменнікі праз народазнаўчы матэрыял аб'ектывізаванага і сімбіятычнага тыпаў адцянялі зменлівасць часу, тыпізавалі абставіны, асобасна характарызавалі персанажаў, выяўляючы пры гэтым уласную аўтарскую своеасаблівасць. Творы І. Пташнікава, напрыклад, вылучаюцца феналагічнай дэталізацыяй, метафарычным абагульненнем этнаграфічных малюнкаў, перавагай бытавога і пейзажнага відаў мастацкага этнаграфізму. Ранняя, лірычная па танальнасці, проза В. Адамчыка ("Жывая вада", "Матчына песня") праз узнаўленне побыту даследавала чалавечую псіхалогію, мастацкі этнаграфізм у ёй выступаў сродкам паэтызацыі малой радзімы. З сярэдзіны 60-х гадоў талент Адамчыка эвалюцыянаваў у эпічным напрамку. Шырокім мастацкім палатном, звернутым да праблем агульнанацыянальнага гучання, дзе на першае месца выходзілі Радзіма і яе лёс у нядаўнім мінулым, стала тэтралогія Адамчыка, што складалася з раманаў "Чужая бацькаўшчына", "Год нулявы", "І скажа той, хто народзіцца", "Голас крыві брата твайго", тыпалагічна блізкая па народазнаўчай накіраванасці да такіх твораў, як "Мужыкі" У. Рэйманта, "Ціхі Дон" М. Шолахава, "Страчаны прытулак" Ё. Авіжуса. Падрабязна выпісаны этнаграфічна-бытавы і сацыяльны рэгіянальны каларыт дапамагаў пісьменніку глыбока раскрыць нацыянальную і гістарычную адметнасць

заходнебеларускага жыцця з 1938 па 1944 год. Мастацкае народазнаўства ў раманах Адамчыка, як і ў "Палескай хроніцы" Мележа, канцэптуальна дэтэрміnavалася аўтарскай задачай стварыць пераканаўчую сацыяльна-гістарычную карціну заходнебеларускай рэчаіснасці, выявіць асноўныя рысы характару суайчыннікаў. Багаты этнаграфічна-бытавы матэрыял з'яўляўся не толькі сэнсаўтваральным, але і структураўтваральным элементам, семантыка і роля якога ўплывалі на жанравую мадыфікацыю раманнай формы: у двух апошніх раманах бытавы план істотна дапоўніўся гістарычным, філасофскім, псіхалагічным, дзе мастацкі этнаграфізм выконваў сэнсава-генератыўную функцыю, што спрыяла перарастанню сацыяльна-бытавога рамана, якім была "Чужая бацькаўшчына", у сацыяльна-псіхалагічны з элементамі філасофскага ("Голас крыві брата твайго").

Асаблівасцю выкарыстання народазнаўчай фактуры ў айчыннай прозе другой паловы XX стагоддзя стаў рост пісьменніцкай увагі да першачарговага адлюстравання рэгіянальнага каларыту. Такая тэндэнцыя ў многім дыктавалася асобасна-творчымі фактарамі, узмацненнем цікавасці аўтараў да паглыбленай распрацоўкі традыцыйных у беларускай літаратуры "вясковай" і "ваеннай" тэм. Этнаграфічна-рэгіянальная спецыфіка Усходняга Палесся праз народазнаўчы матэрыял у функцыі перш за ўсё культуралагічнай увасобілася ў творах Б. Сачанкі, Магілёўшчыны – у пенталогіі І. Чыгрынава, накіраванай на спасціжэнне духоўна-ментальных асноў характару беларуса ў драматычных умовах фашысцкай акупацыі, на выяўленне гераічнага ў паўсядзённым.

Інтэнсіўны працэс урбанізацыі ў многім спрыяў эпічнаму асэнсаванню празаікамі лёсу сучасніка ў творах І. Шамякіна, В. Карамазава, А. Кудраўца, А. Жука. Народазнаўчы ракурс у прозе І. Шамякіна адметны засяроджанасцю пісьменніка на маральна-этычных праблемах, праз вырашэнне якіх выяўляліся вядучыя рысы грамадскай і псіхалагічнай атмасферы часу. Шамякін ярка і пераканальна ўвасобіў імклівае развіццё новай сацыяльнай панарамы беларускай рэчаіснасці ў другой палове XX стагоддзя, даследуючы характары прадстаўнікоў вясковай і гарадской інтэлігенцыі. Проза Карамазава галоўным чынам геаграфічна лакалізаваная, месцам дзеяння ў ёй выступала Магілёўшчына. Рэгіянальна-этнаграфічны каларыт раскрываўся пісьменнікам праз жыццё і побыт людзей, звязаных з лясной гаспадаркай, праз рэльефныя пейзажныя апісанні. Народазнаўчы матэрыял аб'ектывізаванага тыпу ў творах В. Карамазава – важны эмфатычны сродак, ён артыкулюе маральныя імператывы аўтара, паэтызуе духоўную спадчыну беларусаў як залог іх будучыні. У творах А. Жука і А. Кудраўца аб'ектывізаваны і сімбіятычны мастацкі этнаграфізм, фактычна пазбаўлены рэгіянальнага акцэнту, падкрэсліваў абумоўленыя часам і абставінамі жыцця перамены ў светаадчуванні і паводзінах суайчыннікаў, а нярэдка, як у аповесці "Раданіца" А. Кудраўца, вырастаў да

ўзроўню аб'ёмнай метафары, дзе апісанне святкавання раданіцы – увасабленне пісьменнікам непарыўнага адзінства жыцця і смерці, іншасказальнае абазначэнне складанага лёсу пасляваеннай вёскі.

У межах эпічнай плыні ў прозе другой паловы XX стагоддзя па семантычна-структурнай дамінанце выдзяляецца аналітычны напрамак, прадстаўнікі якога (В. Быкаў, В. Казько) аддавалі перавагу сэнсава-генератыўнай функцыі народазнаўчых апісанняў і дэталей. Цэнтральнае месца ў творчасці Быкава займала даследаванне духоўных магчымасцей чалавека ў сітуацыі выбару паміж жыццём і смерцю, маральным абавязкам і часовай выгадай. Рэдкія этнаграфічна-бытавыя дэталі ў ранніх аповесцях пісьменніка сімвалічна пазначалі лёс персанажаў. Шмат увагі адводзілася побыту беларуса-вяскоўца ў аповесці "Знак бяды", дзе рэчаіснасць адначасова прадставала ў канкрэтна-побытавым і алегарычна-абагульненым выглядзе, дзе этнаграфічна-бытавое прыўздымалася да ўзроўню філасофскага дзеля выяўлення сутнасных рыс нацыянальнага характару беларуса. Аналітызм, паглыбленая сацыяльнасць – асноўныя рысы мастацкага народазнаўства ў творах Быкава. Эстэтычнаму асэнсаванню рэчаіснасці і чалавека ў прозе В. Казько ўласцівы сінтэз тыповага з архетыпным, свядомая інтэрыярызацыя складнікаў мастацкай прасторы твора. Народазнаўчы матэрыял у гэтага пісьменніка вылучаецца метафарычнасцю, асацыятыўнасцю, трансмутацыяй семантыкі традыцыйных этнаграфічных элементаў, што істотна паглыбляе філасофскі змест аповеду. Напрыклад, згадка пра купальскі агонь у аповесці "Суд у Слабадзе" як сілу знішчальную, а не ачышчальную падкрэслівае антыгуманную сутнасць вайны, а паказ палескага вяселля з украдзеным караваем у рамане "Неруш" – сімвалічнае абазначэнне абкрадзенага чалавекам-спажыўцом свету.

Актыўнае выкарыстанне беларускімі пісьменнікамі народазнаўчага матэрыялу дыктавалася неабходнасцю стылёвага ўзбагачэння прозы, паглыбленай цікавасцю аўтараў да нацыянальнай рэчаіснасці і развіцця нацыянальнага характару, да маральных каштоўнасцей, выпрацаваных народам на працягу стагоддзяў. Пры асэнсаванні вытокаў і перспектыў характараў суайчыннікаў пісьменнікамі праз элементы мастацкага народазнаўства артыкулявалася важная роля народных традыцый для нацыянальнай і этычнай самаідэнтыфікацыі асобы. У прозе гэтага перыяду сэнсавы план пададзенага аўтарамі народазнаўчага матэрыялу, у параўнанні з папярэднімі этапамі развіцця айчыннай літаратуры, адыгрываў значна большую ролю, чым прадметны, што сведчыла пра далейшы рост інтэлектуалізацыі беларускага мастацтва слова. Проза І. Мележа, Я. Брыля, У. Караткевіча, В. Быкава, В. Адамчыка, І. Чыгрынава, В. Казько – аргументаваны доказ таго, што народазнаўчы матэрыял узбагачае мастацкую палітру твораў нацыянальным каларытам, пашырае семантычнае поле эпічнасці, паглыбляе іх ідэйны патэнцыял.

У падраздзеле **4.2 "Пошук выяўлення нацыянальнай ідэнтычнасці ў сучаснай беларускай прозе"** зазначаецца, што магістральная лінія мастацкага народазнаўства ў сучаснай айчыннай прозе – асэнсаванне нацыянальнай рэчаіснасці ў непарыўным адзінстве трох мадальнасцей часу, дзе асаблівая роля пісьменнікамі адводзіцца мінуламу і будучаму, роздуму пра перспектывы далейшага існавання беларусаў і чалавецтва ўвогуле.

Дзеля спасціжэння і развіцця нацыянальнай ідэнтычнасці суайчыннікаў празаікі міфалагізуюць і паэтызуюць гісторыю беларускага народа, вялікую ўвагу пры гэтым яны звяртаюць на выдатных асоб, гераічныя і трагічныя старонкі былога. Мастацкае народазнаўства застаецца стылёвай і жанраўтваральнай дамінантай гістарычнай прозы. Паводле яго праблемна-тэматычнай накіраванасці і вобразна-выяўленчага ўвасаблення ў беларускай гістарычнай прозе канца XX стагоддзя прыкметна вылучаюцца тры напрамкі: лірыка-рамантычны (Л. Дайнека, В. Іпатава, В. Чаропка), дзе значная ўвага надаецца эмацыянальна афарбаванаму этнаграфічнаму матэрыялу, часта з устаноўкай на экзатычнасць; рэалістычны па дамінантным спосабе мастацкага абагульнення (К. Тарасаў, В. Коўтун, І. Шамякін, Г. Далідовіч, У. Дамашэвіч, на пачатку творчага шляху У. Арлоў), дзе этнаграфічны матэрыял галоўным чынам рэпрэзентуе пэўную эпоху, тыпізуе характары і абставіны; постмадэрнісцкі (У. Бутрамееў, А. Наварыч, Л. Рублеўская, У. Арлоў з другой паловы 90-х гадоў), у творах якіх наглядаецца мэтанакіраванае ўзаемадзеянне канкрэтна-гістарычнага і абагульнена-метафарычнага планаў паказу рэчаіснасці ў спалучэнні з выкарыстаннем прынцыпаў інтэртэкстуальнасці і гульнёвасці. Народазнаўчы матэрыял з культуралагічнай і сюжэтна-кампазіцыйнай функцыямі надае ідэйна-эстэтычную непаўторнасць жанрам прыгодніцкай, фантастычнай, урбаністычнай прозы, што імкліва развіваюцца з канца мінулага стагоддзя. Сучасныя беларускія пісьменнікі (Л. Дайнека, В. Іпатава, А. Казлоў, В. Казько, А. Кажадуб, А. Наварыч, Я. Сіпакоў, Л. Рублеўская) для даследавання характару суайчыннікаў у гістарычнай дынаміцы, для абнаўлення выяўленчых сродкаў нярэдка звяртаюцца да міфалагічных вобразаў, што звычайна дапаўняюцца выразнымі этнаграфічнымі дэталямі. Такім чынам у гістарычнай прозе, як правіла, тыпізуюцца нацыянальна-гістарычныя рэаліі, а ў творах пра сучаснасць узмацняецца філасофскае гучанне тэмы. Прыкметна павялічылася ўвага пісьменнікаў да сэнсавыяўленчых магчымасцей асіметрычнага этнатопу ў працэсе эстэтычнага асэнсавання праз кампаратыўны план суадносін нацыянальнай рэчаіснасці і ментальнасці людзей, што пацвярджаюць раманы "Уліс з Прускі", "Расія" У. Гніламёдава, аповесць "Камендантскі час для ластавак" А. Брава і інш.

Усведамленне вясковага свету як трывалага нацыянальнага фундаменту доўгі час было лейтматывам айчыннай прозы, адной з цэнтральных ліній у

творчасці В. Казько, Я. Сіпакова, М. Вайцяшонак, Х. Лялько і інш. становіцца акцэнтацыя перараджэння вясковай рэчаіснасці і характару вяскоўцаў пад уплывам далейшага развіцця цывілізацыі, урбанізацыі. А. Федарэнка праз апісанне адчуванняў, уяўленняў, традыцыйных звычаяў народа на аснове алюзій і рэмінісцэнцый з твораў нацыянальнай класікі занатоўвае маральнае самапачуванне і матэрыяльнае становішча сённяшняга беларуса-вяскоўца, а сакральнаму для айчыннай літаратуры паняццю роднага кута надае семантычную амбівалентнасць. Плённым прыкладам мастацка-герменеўтычнай рэфлексіі над нацыянальнай празаічнай традыцыяй у асвятленні народнага жыцця з'яўляецца раман "Рэвізія" Федарэнкі, дзе інтэртэкстуальнасць, этнаграфічныя метаапісанні акцэнтуюць неабходнасць крэатыўнага падыходу да паказу рэчаіснасці з боку пісьменнікаў, пастаянную запатрабаванасць наватарства ў літаратуры.

Беларуская проза канца XX стагоддзя захоўвала вернасць народазнаўчаму пафасу, рэалістычнай паэтыцы, асімілюючы элементы мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага пісьма, бо новыя гістарычныя ўмовы паставілі на парадак дня пытанне пра абнаўленне культурна-мастацкай парадыгмы, што адбілася не толькі на ідэйна-тэматычнай і жанрава-стылёвай палітры айчыннай прозы, але і на сэнсава-функцыянальнай спецыфіцы народазнаўчага матэрыялу. Мастацкае народазнаўства ў сучаснай беларускай прозе дэтэрмінуецца неабходнасцю пацвярджэння яе эстэтычнай ідэнтычнасці, развіццём прыгожага пісьменства ва ўмовах полікультурнасці і глабалізацыі. Адлюстраванне нацыянальнага свету, пераасэнсаванне аўтаэтнастэрэатыпаў нацыянальнага характару – спроба айчыннай прозы процістаяць глабалізацыйным працэсам уніфікацыі ў сферы культуры, даказаць сваю нацыянальную і эстэтычную "самасць". Вядучай функцыяй народазнаўчага матэрыялу ў сучаснай беларускай прозе становіцца сэнсава-генератыўная. Айчынныя пісьменнікі актыўна звяртаюцца да этнаграфічных метаапісанняў, алюзій і рэмінісцэнцый з мэтай творчага засваення нацыянальнай і сусветнай празаічнай традыцыі, да надання іншасказальнасці народазнаўчаму матэрыялу.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Адметнасць мастацкага асэнсавання народа тлумачыцца галоўным чынам асаблівасцямі эстэтычнага асваення свету ў літаратуры. Народазнаўчы матэрыял, які акумулюе ў сабе інфармацыю пра быт, лад жыцця, гісторыю народа, захоўвае яго шматвяковы вопыт і погляд на свет, выяўляе субстрат нацыянальнай культуры, у адпаведнасці з законамі літаратурнай творчасці,

непадзельнай з выкарыстаннем мастацкай умоўнасці, канцэптуальна апрацоўваецца пісьменнікамі і падаецца ў вобразнай слоўнай форме, дзе спалучаюцца аб'ектыўнае і суб'ектыўнае, канкрэтнае і абагульненае, лагічнае і інтуітыўнае, таму вынікі эстэтычнага спасціжэння народа генетычна дыялагічныя і кантэкстуальныя. Дзякуючы аксіялагічнаму плану адрэфлексаванага празаікамі нацыянальнага свету мастацкае народазнаўства валодае мадэлюючай гнасеалагічнай і эстэтычнай энергіяй. Народазнаўчы матэрыял у літаратурным творы прадстае ў адзінстве эстэтычнага, пазнавальнага і камунікатыўнага бакоў. Эстэтычны і анталагічны феномены мастацкага народазнаўства вызначаюцца багаццем і адзінствам прадметнага і сэнсавага планаў матэрыялу, пададзенага пісьменнікамі [1; 2; 19; 25; 26; 27; 30; 31; 32; 33; 48; 55; 58; 59; 64; 65; 71; 88; 98].

2. Адчувальная прысутнасць народазнаўчага плана ў творах беларускіх празаікаў XX стагоддзя абумоўлівалася аб'ектыўнымі сацыякультурнымі і суб'ектыўна-асобаснымі фактарамі. Да ліку аб'ектыўных сацыякультурных фактараў адносіліся складанасць гістарычнага быцця, паступовая ўрбанізацыя, наяўнасць рэліктавых з'яў у самой рэчаіснасці, развіццё ў полікультурнай прасторы, уплыў нацыянальнай літаратурнай традыцыі. Суб'ектыўна-асобасныя фактары – гэта пошук аўтарамі сродкаў сцвярджэння нацыянальнай і мастацкай ідэнтычнасці айчыннага прыгожага пісьменства, вялікая асабістая зацікаўленасць празаікаў народным жыццём і народнай культурай [1; 2; 7; 10; 13; 16; 18; 19; 20; 21; 22; 23; 24; 29; 31; 32; 38; 40; 41; 46; 47; 66; 67; 69; 75; 77; 83; 84; 87; 88; 91; 94].

3. Асобым перыядам у развіцці мастацкага народазнаўства ў прозе Беларусі XX стагоддзя сталі 1920–1930-я гады. Сітуацыя полікультурнасці і полілінгвізму спрыяла фарміраванню шматлітаратурнага працэсу (беларускага, рускага, польскага, яўрэйскага, літоўскага). Праз вылучэнне асноўнага аб'екта пазнання, які, паводле аўтараў і тагачаснай грамадскай думкі, найбольш поўна рэпрэзентаваў працоўнага чалавека (у беларусаў і літоўцаў – сялян, у палякаў – шляхту і сялян, у яўрэяў – рамеснікаў), мастацкае народазнаўства было накіравана на першачарговае спасціжэнне пісьменнікамі рэалій свайго ўласнага нацыянальнага свету ў зменлівых сацыягістарычных абставінах, што аб'ектыўна падкрэслівала эстэтычную ідэнтычнасць іншанацыянальных аўтараў [2; 32; 34; 103].

4. Узнаўленне субстанцыянальных этна-псіхалагічных рыс народа, паказ найбольш важных, паводле разумення празаікаў, падзей народнага жыцця ажыццяўляліся праз выбар адэкватных сродкаў і прыёмаў увасаблення. Дамінантнымі сродкамі мастацкага народазнаўства ў беларускай прозе мінулага стагоддзя выступалі мастацкі этнаграфізм, фалькларызм, міфалагізм. Да асноўных прыёмаў мастацкага народазнаўства належалі апісанні ад імені

аўтара, апавядальніка, персанажаў, пададзеныя асобна або ў іх спалучэнні; метаапісанні; выкарыстанне вобразаў і матываў вуснай народнай творчасці, аўтаэтнастэрэатыпаў і гетэраэтнастэрэатыпаў; сіметрычны этнатоп; кампаратыўны паказ іншанацыянальнай рэчаіснасці [1; 2; 8; 9; 12; 27; 28; 29; 31; 37; 49; 53; 58; 60; 64; 73; 89; 99; 102; 103].

5. Народазнаўчы матэрыял у творах беларускіх празаікаў XX стагоддзя – рознаўзроўневая, шматзначная, поліфункцыянальная эстэтычная з'ява. Айчыннымі пісьменнікамі ён быў задзейнічаны ў змесце, характарыстыцы персанажаў, сюжэце, мове твораў. Па спосабах уключэння ў структуру твора прысутнічаў народазнаўчы матэрыял аб'ектывізаванага, суб'ектывізаванага і сімбіятычнага тыпаў. Паводле сферы ўзнаўлення народазнаўчы матэрыял падзяляўся на наступныя віды: сацыяльны, бытавы, пейзажны; у залежнасці ад таго, прадстаўлены былі ў творы асаблівасці матэрыяльнай або духоўнай культуры ўсёй Беларусі ці асобнага яе рэгіёна, – агульнанацыянальны і рэгіянальна-абласны. Да асноўных функцый народазнаўчага матэрыялу адносіліся культуралагічная, сюжэтна-кампазіцыйная, характаратворчая, сэнсава-генератыўная, жанраўтваральная і стылеўтваральная. Народазнаўчы матэрыял у творах беларускіх празаікаў мінулага стагоддзя служыў выяўленню сацыяльнага і бытавога бакоў народнага жыцця. Калі ў прозе XIX стагоддзя праз элементы мастацкага народазнаўства аўтары пазначалі этнічную адметнасць і сацыяльнае становішча беларусаў, то пісьменнікі першай трэці XX стагоддзя даследавалі асаблівасці нацыянальнага характару, абумоўленыя сацыяльна-гістарычнымі абставінамі; сацыяльны аспект народазнаўчага матэрыялу прыцягваў увагу аўтараў 30-х – сярэдзіны 50-х гадоў; з другой паловы XX стагоддзя літаратары, канчаткова не адмяжоўваючыся ад сацыяльнага, зноў пераключыліся на асэнсаванне нацыянальнага ў яго гістарычнай рэтраспектыве і перспектыве. Пастаянная прысутнасць культуралагічнай функцыі ўказвае на тое, што гэта галоўная функцыя народазнаўчага матэрыялу ў айчыннай прозе, нелінейная дынаміка іншых функцый сведчыць пра важную ролю асобаснага пачатку ў пісьменніцкай працы. Класіфікацыя тыпаў, відаў, функцый народазнаўчага матэрыялу, праведзеная на матэрыяле беларускай прозы XX стагоддзя, можа служыць метадалагічнай асновай для тыпалагічнага вывучэння іншанацыянальных літаратур [2; 9; 11; 13; 14; 17; 19; 30; 31; 37; 43; 68; 70; 78; 85; 91; 92; 93].

6. Дынаміка мастацкага народазнаўства, абумоўленая карэлятыўным узаемадзеяннем сацыякультурных і асобасна-творчых фактараў, – гэта змена тэматычна-прадметнай накіраванасці ў вывучэнні народнага свету, тыпаў, відаў і функцый народазнаўчага матэрыялу ў структуры твораў і ў літаратурным працэсе ўвогуле. Айчыннымі празаікамі пачатку XX стагоддзя перавага аддавалася ўключэнню ў творы народазнаўчага матэрыялу аб'ектывізаванага

тыпу, сацыяльнага, бытавога і пейзажнага відаў. Народазнаўчы матэрыял у творах першай трэці XX стагоддзя выконваў галоўным чынам культуралагічную, характаратворчую, радзей сэнсава-генератыўную функцыі. У прозе 30-х – сярэдзіны 50-х гадоў дамінаваў народазнаўчы матэрыял аб'ектывізаванага тыпу, сацыяльнага і бытавога відаў з функцыямі культуралагічнай і характаратворчай; у прозе другой паловы 50-х – канца мінулага стагоддзя – сімбіятычнага і аб'ектывізаванага тыпаў, бытавога і пейзажнага відаў, часта ў рэгіянальна-абласным варыянце з шырокай распаўсюджанасцю сэнсава-генератыўнай і культуралагічнай функцый. Эвалюцыя семантыка-функцыянальнай ролі народазнаўчага матэрыялу ў беларускай прозе XX стагоддзя заключалася ў паступовым замяшчэнні разгорнутых апісанняў лаканічнымі дэталямі і метаапісаннямі, ва ўзрастанні эстэтычнай ролі сэнсавага плана адлюстраваных празаікамі этнарэалій [1; 2; 13; 15; 39; 72; 74; 81; 105].

7. На працягу XX стагоддзя ў беларускай прозе актыўна развівалася сацыяльна-бытавая плынь, у аснове якой ляжаць трансфармацыі матываў так званага ідылічнага хранатопу, пераважна матываў хранатопу земляробча-працоўнай ідыліі з яго вялікай увагай да побытавых з'яў і пейзажных малюнкаў. Пісьменнікаў хвалявалі праблемы нацыянальнага жыцця, што раскрываліся на грунце сялянскай рэальнасці. Народазнаўчы матэрыял першапачаткова прысутнічаў практычна ва ўсіх жанрах, ён не ўздзейнічаў на жанравую ідэнтыфікацыю твораў, і толькі з другой паловы XX стагоддзя, калі ў айчыннай прозе істотна павялічыўся сацыямастацкі спектр даследавання, семантыка, сінтактыка і прагматыка народазнаўчага матэрыялу сталі актыўна ўплываць на карэкцыю жанравых форм празаічных твораў, а сам ён трывала замацаваўся ў падарожных нарысах, гістарычнай і "вясковай" прозе рэтраспектыўнага характару, дзе выступае адным з вызначальных паказчыкаў жанравай прыналежнасці твора [2; 9; 11; 13; 17; 20; 43; 45; 49; 50; 51; 54; 56; 57; 58; 63; 70; 79; 80; 82; 85; 92; 94; 95].

8. Спецыфіка ўключэння беларускімі пісьменнікамі народазнаўчага матэрыялу ў структуру літаратурнага твора залежала ад выбару мастацкіх метадаў, а семантыка і функцыянаванне народазнаўчага матэрыялу непасрэдна ўплывалі на іх паэтыку. Прыхільнікі рамантычных прынцыпаў адлюстравання галоўным чынам звярталіся да ўзнаўлення экстраардынарнага ў нацыянальным матэрыяльным і духоўным свеце (К. Каганец, ранні М. Гарэцкі, М. Зарэцкі, У. Караткевіч, В. Іпатава), тым самым яны падкрэслівалі непаўторнасць нацыянальнай рэчаіснасці, праз паказ беларускай этнаграфічнай экзотыкі міфалагізавалі і тыпізавалі свет народнага жыцця. Прадстаўнікі рэалізму (Я. Колас, Л. Калюга, І. Мележ, Я. Брыль, І. Шамякін, І. Пташнікаў, І. Чыгрынаў, В. Адамчык, У. Дамашэвіч і інш.) праз народазнаўчыя апісанні і

